№ 37 (395) 8 кастрычніка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Спадар сантэхнік**
Рэформа жыльлёва-камунальнай гаспадаркі.
старонка 4

**Гуд-бай, Ленін, хай, Гітлер**
Лёлік Ушкін пра нэанацызм.
старонка 6

**Прывід Якуба Коласа,**
Кат лета і іншыя замалёўкі Сяргея Балахонава.
старонка 15

**Уладзімер Мацьвяйчук**
«Няма ніводнага дня, каб прэзыдэнт не займаўся фізкультурай».
старонка 14



Свабода не гарантуе высокага жыцьцёвага ўзроўню. Але безь яе ўсё іншае ня мае сэнсу. Лекцыя Клаўды Нольтэ. **Старонка 4.**

## Народ пра рэфэрэндум

«Мы ўсе глядзім у Напалеоны». — Адкрыты ліст настаўніка гісторы настаўніку гісторыі.— Мясьніковіч пабялеў. — Аляксандар Вайтовіч: Ёсьць пэўныя тэхналёгіі. **Старонкі 2, 11, 14.**

## Кандыдаты «Пяцёркі» ў 98 акругах

Кандыдаты, падтрыманыя дэмакратычнай кааліцыяй «Пяцёрка+», ідуць у 98 акругах з 110. У 19 зь іх выступаюць незалежныя кандыдаты, што салідарызуюцца з плятформай дэмакратаў. У 30 акругах выбарцы будуць мець выбар паміж кандыдатамі-дэмакратамі, якія прадстаўляюць розныя партыі. Яшчэ ў 25 акругах кандыдаты «Пяцёркі» супернічаюць з прадстаўнікамі «Народнай грамады».

Зразумела, «пяцёрачнікаў» няма ў васьмі безальтэрнатыўных акругах краіны (у дзявятай, Баранавіцкай сельскай, са спазьненьнем зарэгістравалі кандыдата ад ПКБ).

З 18 выбарчых акруг Менску «пяцёрачнікаў» няма толькі ў Шабаноўскай акрузе №93, дзе балятуецца дзейны дэпутат ПП Кірыла Халопік, ды ў Васьняцоўскай акрузе №95.

**Глеб Хмяльніцкі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Вера кардынала

**Старонка 8.**

А Г І Т П Р А П

## Прызнаньні беларускай Кандалізы

Перад выбарамі, як на Купальле, здараюцца цуды: у дварах загараюцца пасьля трохгадовага перапынку ліхтары, стыпэндыі растуць, як бульба на навіне, а жыхарам асобных рэгіёнаў прэзыдэнт дорыць газаправоды. У апошнім выпадку мы маем справу з камбінацыяй павышанай хітрасьці. Уявіце сабе, што вы плаціце 400 даляраў, і АТС праводзіць вам тэлефон. Пасьля чаго да вас у кватэру прыходзіць начальнік АТС, трасе вам руку і кажа: я ж абяцаў вам, што тэлефон прыйдзе ў кожны дом. Тэлефонная сувязь дарагая, але мы будзем працягваць забясьпечваць вас ёю, нягледзячы на стогны непрыяцеляў, і ніякай дэстабілізацыі не дапусьцім. Вось так і прэзыдэнт з газаправодам, пабудаваным за людзкія падаткі.

Маразмы множацца. Уявіце сабе, што Джордж Буш заклікаў кіраўнікоў уладных структураў ЗША «ня проста выйграць выбары, абраўшы 100 дэпутатаў сэнату ў першым туры, а камень на камені не пакінуць ад унутранай і зьнешняй апазыцыі». Як вы думаеце, каго б выклікала Лора Буш, пачуй яна такія словы?

У бездакорнай сыстэме кіраванай дэмакратыі ёсьць адзін маленькі недахоп: кожныя пяць гадоў мусяць адбывацца выбары. Іначай упадзе дэмакратычная шырма. Але пакуль адбываюцца выбары, датуль ёсьць небясьпека, што аднойчы людзі прагаласуюць супраць, і зьяўляюцца нягоднікі, якія маюць нахабства кінуць выклік блёку беспартыйных і ЛДПБ. Таму асобы, адказныя за законнасьць у краіне, пачынаюць загадзя атакаваць сыстэму незалежнага назіраньня. Правакацыя! — крычаць яны. — Калавур, таварышы! І што ж за правакацыю выявіла беларуская Кандаліза Райс? Аказваецца, кандыдаты рыхтуюць назіральнікаў за падлікам галасоў. Ах, нізкія! Яны не давяраюць нашай высокадухоўнай Лідзіі Ярмошынай.

«Відавочнае імкненьне забясьпечыць умовы, пры якіх апазыцыя зможа настойваць на паўторным падліку галасоў», — пачулі мы ад Генадзя Нявыгласа ў сераду. Цікава-цікава. Ад чаго ж гэта самая сумленная ўлада на сьвеце баіцца перападліку галасоў? Хай бы пералічылі, калі хочуць, хай бы па сьпісах пераправерылі працэнт удзелу. А то «палітолягі» — гэта так цяпер называецца на СТВ — «прагназуюць вельмі высокую яўку выбарцаў — ня менш за 90%».

Ужо і Расея падтрымала прэзыдэнта газам, і Амэрыка дабавіла яму 10% галасоў Актам пра дэмакратыю, а назіральнікаў ён усё адно баіцца, як чорт крыжа.

У 1984 годзе краіна штудыявала «Малую зямлю», стаяла ў чэргах па кілбасу, хавала Караткевіча, і хто мог падумаць, што студэнт-завочнік Горацкай сельгасакадэміі праз 20 гадоў будзе панаваць у Беларусі. Калі вам зусім скрушна, на чарговай палітінфармацыі паводле «Гістарычнага выбару Беларусі» думайце пра 2024 год.

**Барыс Тумар**

## Дык падпісвайся

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы, газэты без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

## Скрынка Пандоры

**Міжнародны студэнцкі фэстываль «Тэатральны куфар-2004»**

парушаў спакой грамадзянаў на вуліцах з 29 верасьня да 3 кастрычніка. Пачаўся фэст з урачыстае «цэрэмоніі» (паводле праграмкі, надрукаванае ў элітным БДУ). Да Ліцэю БДУ пад’ехаў «Трамвай жаданьняў». Адтуль выпаўзьлі акторы менскае ды ангельскае трупаў («Infield Barn Theatre» на наступны дзень, каб усьцешыць мясцовых абарыгенаў, прэзэнтуе «Пяць сноў гараднічага» паводле Гогалевага «Рэвізора»). Два падазроныя дзівакі пачалі мяцеліцца балёнчыкамі. Камусьці адтапталі нагу, храбуснулі чыесьці акуляры, хтосьці споўз у гістэрыцы. Гледачы ў гэты час цішком храбусьцелі атрыманымі на дурніцу марожаным «Гоша» ды хрусьцікамі «Патэла». Хрусьцікі ё, дах ня едзе, хай сабе валхвяцы Таліі калашмацяцца…

**Працяг на старонцы 13.**

## Заява Беларускай асацыяцыі журналістаў

5 кастрычніка Міністэрства інфармацыі прыпыніла дзейнасьць газэты «Неделя», якая пасьпела да гэтага часу выпусьціць усяго адзін нумар. Гэта ўжо 11-е выданьне, выпуск якога прыпыніла міністэрства з пачатку выбарчай кампаніі. Сукупны разавы наклад гэтых газэт — больш за 100 тысяч ас.

У 2004 г. міністэрства прыпыняла дзейнасьць 17 недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. У якасьці нагодаў для гэтых жорсткіх захадаў у загадах міністра Уладзімера Русакевіча называюцца нязначныя парушэньні, факт якіх шмат у якіх выпадках нічым не пацьверджаны. Але нават калі гэтыя парушэньні і мелі месца, яны маглі б быць лёгка зьліквідаваныя. Аднак міністэрства цынічна папярэджвала рэдакцыі пра парушэньне закону ў той жа дзень, калі выдавала загады аб прыпыненьні выхаду газэт.

Беларуская асацыяцыя журналістаў:

— выказвае пратэст у сувязі з прыпыненьнем дзейнасьці недзяржаўных друкаваных выданьняў;

— рэзка адмоўна ацэньвае дзейнасьць міністра інфармацыі У.Русакевіча. З моманту прызначэньня яго на пасаду (жнівень 2003 г.) колькасьць зарэгістраваных пэрыядычных друкаваных СМІ ў краіне штомесяц зьмяншаецца ў сярэднім на 20 выданьняў;

— нагадвае службовым асобам міністэрства, што іх дзейнасьць знаходзіцца ў полі пільнай грамадзкай увагі і атрымлівае належную маральную і прававую ацэнку;

— патрабуе ад кампэтэнтных органаў Беларусі тэрмінова спыніць разгорнутую Мінінфармацыі кампанію перасьледу незалежных СМІ;

— выказвае падтрымку рэдакцыйным калектывам прыпыненых выданьняў;

— заклікае чытачоў «часова забароненых» газэт выказваць сваё стаўленьне да таго, што адбываецца.

Выбар, якую газэту чытаць, кожны павінен рабіць сам, а не міністэрскія чыноўнікі, якія прысвоілі сабе права вырашаць гэта за ўсіх.

**На здымку справа: Уладзімер Русакевіч.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Мясьніковіч пабялеў

**Прызначаны на 7—8 кастрычніка Ўсебеларускі зьезд навукоўцаў не адбудзецца. Рашэньне пра адмену было прынятае ў Адміністрацыі прэзыдэнта напярэдадні форуму — у панядзелак 4 кастрычніка.**

Паводле зьвестак «НН», прэзыдэнт Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч атрымаў у Адміністрацыі добрага прачуханца й вярнуўся на месца працы зьбялелым.

Паводле афіцыйнай фармулёўкі, зьезд адмянілі праз адсутнасьць уцямнай ідэі такога форуму. Улада ня мае прапанаваць навуковай супольнасьці нешта прынцыпова новае, навукоўцы ня могуць уплываць на ўладныя рашэньні адносна навукі.

Другой прычынай для каманды «адбой» у навуковых колах называюць палітычную: не ўдалося арганізаваць выступы значных у навуцы фігур, якія б выказаліся ў падтрымку рэфэрэндуму. Зьезд ужо пераносіўся двойчы — увосень 2002 г. і ўвосень 2003 г.

**АШ**

### Юбілей «Народнай волі»

Выйшаў 2000-ы нумар найбольшай незалежнай газэты Беларусі.

### «Раніцы» — 75

Віншуем газэту «Раніца» і яе чытачоў з 75-годзьдзем улюбёнага выданьня! Няхай «піянерка» беларускай дзіцячай прэсы ўпэўнена крочыць у новай рэальнасьці XXI ст., ня здраджваючы роднай мове. Посьпехаў, калегі!

### Увазе прыватных распаўсюднікаў

«Нашу Ніву» для распаўсюду па цане 550 рублёў можна купіць у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### «Крамбамбуля» ў Любані

**9 кастрычніка ў Любані ў раённым цэнтры культуры адбудзецца канцэрт групы «Крамбамбуля». Пачатак а 19.00. Цана білета 3000 рублёў.**

МУЗЫКА

## Вылазьце з кухні і болей туды не вяртайцеся

Міхал Анемпадыстаў

Склалася так, што найбольш прадстаўнічы фэст беларускай аўтарскай песьні «Бардаўская восень» адбываецца не ў вялікіх гарадах Беларусі, а на Беласточчыне, у гасьцінным утульным Бельску. Пры канцы кастрычніка там адбудзецца чарговы, 11-ы па ліку фэстываль. У мінулую пятніцу на адборачным канцэрце ў Доме літаратара былі абраныя тыя, хто будзе на тым фэстывалі выступаць.

Прызнаюся, што я ня самым лепшым чынам абазнаны ў творчым жыцьці беларускіх бардаў, ёсьць шмат людзей, якія ведаюць пра гэта болей за мяне, але позірк «крыху збоку» часам таксама бывае карысны.

Дык вось, мне збоку цікава, што адбываецца зь пераможцамі Бельскіх фэстываляў, куды яны зьнікаюць і чаму іх потым болей не чуваць. Таксама цікава, адкуль бяруцца тыя новыя, якія штогод падаюць заяўкі на ўдзел, а пасьля фэстывалю таксама некуды зьнікаюць. І мне здаецца, што сыходзяць яны туды ж, адкуль прыходзяць, а менавіта на маламэтражную кухню альбо ў цесны інтэрнатаўскі пакой, дзе сьпяваюць свае песьні сябрам. Гэта, з аднаго боку, добра, гэтак і мае быць, але па вялікім рахунку, паводле свайго азначэньня, бардаўская песьня — рэч публічная і, незважаючы на сваю камэрнасьць, мае патрэбу ў шырэйшай аўдыторыі. Я не кажу цяпер пра палітычную ці сацыяльную актуальнасьць тэкстаў. Бардаўская песьня ня мусіць быць актуальнай. Але яна мусіць быць мастацтвам. Мастацтвам тэксту, музыкі, уменьнем сьпяваць, гаварыць і быць самім сабой.

Працяг на старонцы 9.

ЦІЛЯВІЗАР




**У фільмах Азаронка даказваецца, што ненармальна, калі жонка патрабуе знайсьці зьніклага мужа... Выраб бруднай бялізны яшчэ нікому не прыносіў палітычных дывідэндаў.**

IN MEMORIAM

## Памяці вучонага



З Расеі прыйшла сумная вестка — у ноч на 5 кастрычніка памёр, не дажыўшы паўтара месяца да 80-гадовага юбілею, знаны археоляг, акадэмік Расейскай акадэміі навук Валянцін Васілевіч Сядоў.

Усе, хто цікавіцца старажытнай гісторыяй нашага народу, ведаюць В.Сядова як аўтара тэорыі пра вызначальную ролю балцкага субстрату ў этнагенэзе беларусаў. Згодна з гэтай тэорыяй, усе тыя асаблівасьці антрапалягічнага тыпу, этнічнай культуры і мовы беларусаў, якія адрозьніваюць іх ад іншых славянскіх народаў, склаліся ў выніку асыміляцыі балцкіх плямёнаў, якія пражывалі на тэрыторыі нашай краіны да зьяўленьня тут славян. Менавіта за гэтую тэорыю калісьці сумна вядомы Лаўрэн Абэцэдарскі ў сваіх лекцыях у БДУ згадваў В.Сядова разам з «буржуазна-нацыяналістычнымі фальсыфікатарамі гісторыі Беларусі».

Тагачасных працаўнікаў Сядова шакавалі як яго спасылкі на публікацыі Янкі Станкевіча ды іншых забароненых у БССР навукоўцаў, так і тое, што маскоўскі дасьледчык разглядаў этнагенэз беларускай народнасьці фактычна ў этнічных межах паводле Яўхіма Карскага. Прышылася афіцыйная канцэпцыя, згодна зь якой асноўныя асаблівасьці беларусаў склаліся не ў племянны яшчэ пэрыяд, а значна пазьней, калі нашы продкі былі «адарваныя ад усходніх братоў і знаходзіліся пад прыгнётам польска-літоўскіх фэадалаў».

Зь ягонай сьмерцю археалягічная навука сапраўды страціла вельмі шмат.

**Эдвард Зайкоўскі**

# Адбіткі пальцаў

Польскія беларусы расчараваныя вынікамі разгляду ў другім чытаньні праекту закону аб нацыянальных і этнічных меншасьцях ды рэгіянальных мовах. Упершыню праект быў прадстаўлены Сойму яшчэ ў лютым 2002-га. Пасьля разгляду ў першым чытаньні Сойм яго не прыняў. Другое чытаньне сёлета таксама не было плённым: 23 верасьня Сойм зноў паслаў праект на дапрацоўку ў камісіі.

Праект закону вызначае 9 нацыянальных і 4 этнічныя меншасьці Польшчы ды мае на мэце абараніць іх ад дыскрымінацыі ці прымусовай асыміляцыі. Яго падтрымліваюць Саюз дэмакратычнай лявіцы ды іншыя левыя. Супраць выступаюць польскія правыя.

Паводле праекту, у пэўных гмінах (сельсаветах) мовы меншыняў могуць атрымаць статус «дапаможных», г.зн. будзе дазволена выкарыстаньне мовы меншасьці ва ўстановах, а таксама выкарыстаньне назваў вуліц ці мясьцінаў на мове меншасьці. Пярэчаньні датычаць перадусім парадку вызначэньня такіх гмінаў: паводле цяперашняга праекту, мова меншасьці будзе «дапаможнай» на тэрыторыі гмінаў, дзе падчас перапісу насельніцтва больш за 8% заявілі аб сваёй прыналежнасьці да пэўнай меншасьці. Польскія правыя хочуць падняць гэтую лічбу аж да 50%, што робіць шанцы беларускай мовы мінімальнымі.

З рэзкай крытыкай рашэньня Сойму выступіла беластоцкая «Ніва». Прыкрае рашэньне супала зь перадачай у пракуратуру справы аб быццам бы нямэтавым выкарыстаньні грошай Праграмнай радай тыднёвіка. На мінулым тыдні паліцыя ўзяла адбіткі пальцаў ад усіх сяброў управы «Нівы». «Ніўцы» зьвязваюць гэта з спробамі польскіх спэцслужбаў дыскрэдытаваць беларускі рух.

**Алесь Пяткевіч**

## Узнагарода прафэсару-пурысту



Мовазнаўца Павал Сьцяцко ўзнагароджаны мэдалём Скарыны.

Узнагарода была неспадзяванкай: яго, загадчыка катэдры беларускай мовы і тэарэтычнага мовазнаўства Гарадзенскага ўнівэрсытэту і аднаго з найбольш прынцыповых пурыстаў у беларусістыцы, вылучалі больш для раўнавагі Марыі Канюшкевіч, загадчыцы расейскай катэдры таго самага ўнівэрсытэту. Узнагародзілі абаіх.

«Для мяне, — кажа сп.Павал, — гэта ня самая важная ўзнагарода. Вось каб мне далі званьне Заслужанага дзеяча навукі!.. Я ж маю больш за 500 публікацый і 32 кнігі. 11 сакавіка 2005 г. Гарадзенскі ўнівэрсытэт мае ладзіць Рэспубліканскую навуковую канфэрэнцыю «Надзённыя пытаньні беларускага тэарэтычнага мовазнаўства», прымеркаваную да 75-годзьдзя П.Сьцяцка.

«НН» далучаецца да віншаваньняў.

**АВ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кампаніі «Самсунг» і «Панасонік» супернічаюць у беларускамоўнай рэкламе. «Самсунг» пачаў сэзон з новым слоганам.**




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ ПАВОДЛЕ ФОТА АНДРЭЯ ЛЯНКЕВІЧА

# За справядлівыя выбары

**125 кандыдатаў ідуць на выбары ад грамадзкай ініцыятывы «Пяцёрка+». Кожны кандыдат ад «Пяцёркі+» мае закрыць сваімі назіральнікамі свой выбарчы ўчастак.**

«Аднак наша назіраньне — слабае суцяшэньне», — прызнае намесьнік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Сяргей Альфер. Праблема ляжыць глыбей — у працэдуры падліку галасоў, да якое назіральнікі ня маюць доступу. Больш за тое, цяжка да канца пракантраляваць датэрміновае галасаваньне, у якім, як «прагназуюць» улады, возьмуць удзел да 30% выбаршчыкаў.

Эфэктыўнае процістаяньне фальсыфікацыям немагчымае, пакуль «народ ня будзе гатовы ў поўнай меры абараняць законнымі мэтадамі перамогу», — сцьвярджае С.Альфер. На ягоную думку, істотны ўплыў на дзеяньні ўлады падчас выбараў можа зрабіць усьведамленьне, што сьпіс невыязнога чынавенства будзе пашырацца за кошт найбольш актыўных фальсыфікатараў выбараў. «Забарона на выезд у краіны Эўрасаюзу і ЗША чатырох вышэйшых чыноўнікаў Беларусі — гэта пачатак сьпісу. Відавочна, сьпіс будзе пашырацца тымі прадстаўнікамі дзейнай улады, выбарчых камісій, якія праявяць найбольшую актыўнасьць у справе фальсыфікацый», — мяркуе С.Альфер.

Поруч з партыйнымі назіральнікамі за выбарамі зьбіраюцца сачыць 3500 незалежных назіральнікаў з ініцыятывы «Партнёрства». «18 кастрычніка мы здолеем абвясьціць уласныя вынікі галасаваньня на рэфэрэндуме, — кажа каардынатар «Партнёрства» Мікалай Астрэйка. — Для нас прыярытэт — рэфэрэндум, а ня выбары. Мы маем назіральнікаў у 25% участковых камісій, таму нашы зьвесткі мусяць быць цалкам рэпрэзэнтатыўныя».

Толькі вось закавыка: незалежныя назіральнікі баяцца, што іхныя зьвесткі не намнога будуць адрозьнівацца ад афіцыйных. «Як афіцыйныя камісіі, так і незалежныя назіральнікі карыстаюцца адным і тым жа матэрыялам — пратаколамі ўчастковых камісій. Калі пратаколы галасаваньня будуць фальшавацца ўчастковымі камісіямі, мы ня будзем мець сапраўдных зьвестак», — кажа М.Астрэйка.

**Глеб Хмяльніцкі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На пытаньні «НН» адказвае акадэмік Аляксандар Вайтовіч, каардынатар ініцыятывы «За справядлівыя выбары».**

## Аляксандар Вайтовіч: Ёсьць пэўныя тэхналёгіі

**«НН»: У чым палягае дзейнасьць ініцыятывы «За справядлівыя выбары»?**

**АВ:** Яна ўключае назіраньне за ўсімі этапамі выбараў — фармаваньнем выбарчых камісій, зборам подпісаў, рэгістрацыяй кандыдатаў і працэсам агітацыі.

Што да работы афіцыйна зарэгістраваных назіральнікаў, то іх правы агавораныя ў выбарчым кодэксе. Яны могуць прысутнічаць на выбарчым участку пры галасаваньні, у тым ліку датэрміновым. Ім дазволена прысутнічаць пры падліку галасоў, але фактычна яны ня могуць назіраць за падлікам галасоў, таму што іх ставяць мэтраў за 7—10 ад стала, дзе ідзе падлік, або падлік адбываецца ў іншым пакоі, куды не пускаюць назіральнікаў.

Ува ўчастковых выбарчых камісіях менш за 1% прадстаўнікоў апазыцыі. Ужо цяпер участковым камісіям кажуць, каб яны рэгістравалі ў сьпісах менш выбаршчыкаў: маўляў, усе, хто не прыйшоў у мінулы раз на выбары, — іх няма, іх ня трэба ўносіць у сьпіс. Гэта робіцца ў сувязі з рэфэрэндумам. Ёсьць зьвесткі перапісу насельніцтва 1999 г., там усё расьпісана па ўзроставых катэгорыях і відаць, колькі выбаршчыкаў. Таму тут цяжка «сьфінцігь», але яны ўжо спрабуюць.

**«НН»: Ці згодныя Вы, што супрацьстаяць фальсыфікацыям без масавых пратэстаў немагчыма?**

**АВ:** Ну чаму ж. Ёсьць пэўныя тэхналёгіі, яны адпрацоўваюцца, але я не хацеў бы заўчасна пра гэта гаварыць.

**Гутарыў Алесь Пяткевіч**

## ФПБ падтрымлівае прэзыдэнта

Фэдэрацыя прафсаюзаў Беларусі хоча стварыць прафсаюзную фракцыю ў палаце прадстаўнікоў. Ня маючы права вылучаць кандыдатаў, ФПБ робіць стаўку на 45 зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, якія, паводле афіцыйнае інфармацыі, «будуць гатовыя, у выпадку іхняга абраньня ў парлямэнт, адкрыта адстойваць інтарэсы працоўных».



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

ФПБ не хавае, што дзьвюма рукамі падтрымлівае курс кіраўніцтва краіны. Таму ў 6619 участковых камісій дапусьцілі 3705 вылучэнцаў ФПБ, а з 45 падтрыманых ФПБ кандыдатаў у дэпутаты 12 дзейных дэпутатаў. Сам старшыня ФПБ **Леанід Козік** (на здымку) балятуецца на радзіме, у Барысаўскай сельскай акрузе.

**ГХ**

## Лагвінец — супернік Лябедзькі

Рэфэрэндумная кампанія аднязначна падзяліла прыхільнікаў і праціўнікаў А.Лукашэнкі. Неспадзяванкі прыносіць кампанія выбарчая. У 102-й Сухараўскай акрузе Менску кіраўніку АГП Анатолю Лябедзьку давядзецца змагацца за дэпутацкі мандат ня толькі з прадстаўніцай улады і сябрам ЛДПБ, але й з былым сябрам ПБНФ Алесем Лагвінцом. Алесь — палітоляг, раней працаваў выкладчыкам ЭГУ, быў адным зь нешматлікіх беларускамоўных выкладчыкаў гэтага ўнівэрсытэту. Лагвінец пакінуў партыю перад выбарамі й цяпер балятуецца як незалежны кандыдат. Ён ня лічыць сябе раскольнікам і перакананы, што набярэ галасоў больш за Лябедзьку. Але ён згодны агітаваць сваіх выбарцаў аддаць галасы дэмакратычнаму канкурэнту, калі той выйдзе ў другі тур.



Выбары ў 102-й акрузе — адна з выпрабавальных пляцовак новага пакаленьня палітыкаў, якія вызнаюць эўрапейскія дэмакратычныя каштоўнасьці, але ня бачаць сабе месца ў цяперашняй партыйнай сыстэме і ня могуць прыняць сацыяльнае і нацыянальнае праграмы цяперашніх лібэралаў. Хто здабудзе большую прыхільнасьць у выбарцаў: вядомы партыйны кандыдат ці дэмакрат-адзіночка, — пабачым праз паўтара тыдня. На здымку — Алесь Лагвінец з сынам Антосем

**АШ**

## БАЖ — кандыдат на прэмію Эўрапарлямэнту

Беларуская асацыяцыя журналістаў засталася адным з трох кандыдатаў на Сахараўскую прэмію Эўрапарлямэнту БАЖ разам з выкрадзенай у 2002 г. калюмбійскай дэпутаткай Інгрыд Бэтанкур і парай расейскіх праваабаронцаў. Прэмія імя Андрэя Сахарава «За свабоду думкі», якая складае 50 тысяч эўра, будзе ўручаная на сьнежаньскай сэсіі Эўрапарлямэнту.

## Дазвол на мітынг атрымаў Скрабец

Менгарвыканкам пасьля прамаруджаньня даў дазвол дэпутату групы «Рэспубліка» Сяргею Скрабцу на правядзеньне мітынгу-канцэрту 10 кастрычніка. Акцыя адбудзецца а 15 гадзіне ў парку Дружбы народаў ля плошчы Бангалор. Чакаецца ўдзел дэмакратычных кандыдатаў.

## Фралоў не дамовіўся з Машэравай

5 кастрычніка Натальля Машэрава папрасіла Цэнтравыбаркам даць прававую ацэнку агітацыйнай улётцы генэрала Фралова, у якой прыведзены тэкст заявы ў падтрымку свайго абраньня, якую яна не падпісвала. В.Фралоў тлумачыць інцыдэнт тэхнічнай памылкай.

## КХП патрабуе адклікаць назіральнікаў

На Сойме, які адбыўся 3 кастрычніка, Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ заклікала АБСЭ адклікаць сваіх назіральнікаў за выбарчай кампаніяй. КХП-БНФ прапануе замест назіраньня папярэдзіць пра непрызнаньне вынікаў гэтых выбараў.

## Украіну чакаюць у NATO

На сустрэчы з студэнтамі ў Варшаве намесьнік міністра абароны ЗША Пол Вулфавіц заявіў, што «наша мэта стварэньня адзінай Эўропы ня будзе дасягнута, пакуль Украіна ня ўвойдзе ў NATO». «Таму мы павінны сканцэнтраваць нашы намаганьні на Ўкраіне», — дадаў ён.

## Дакумэнт пра забойства Папялушкі

Праз 20 гадоў сталі вядомы новыя факты пра забойства ксяндза Папялушкі — адно з самых вядомых злачынстваў спэцслужбаў камуністычнае Польшчы. Дакумэнт, атрыманы ад прыватнае асобы, апублікаваў гісторык Андэй Пашкоўскі. Гэта запіс з сустрэчы ва ўрадзе з удзелам ген.Ярузэльскага, 1984 г. З дакумэнту вынікае, што загад на забойства ксяндза даў сакратар ЦК ПАРП Міраслаў Мілеўскі. Органы юстыцыі пачалі сьледзтва. Сам Мілеўскі ўсё адмаўляе.

## Нобэлеўская прэмія за нюх

Нобэлеўская прэмія па фізіялёгіі і мэдыцыне прысуджаная амэрыканскім навукоўцам Рычарду Аксэлю і Ліндзе Бак за дасьледаваньне нюху чалавека. Да адкрыцьцяў Аксэля і Бак прырода распазнаваньня пахаў была загадкай.

## Новы альбом Тома Ўэйтса

называецца «Real Gone». Адзін з найлепшых рок-музыкаў сучаснасьці ня здрадзіў той стылістыцы, у якой працуе ўжо 30 гадоў. Сам ён назваў новы альбом «фанкі-кубізмам».

**AP; БелаПАН, gazeta.pl, радыё «Свабода»**

БАЖ — кандыдат на прэмію Эўрапарлямэнту
Беларуская асацыяцыя журналістаў засталася адным з трох кандыдатаў на Сахараўскую прэ-

# Свабода нічога не гарантуе, але безь яе ўсё іншае ня мае сэнсу


Клаўдыя Нольтэ

Дэпутатка Бундэстагу, дакладчыца ад фракцыі ХДС-ХСС у справах Беларусі, фэдэральны міністар у адстаўцы Клаўдыя Нольтэ наведала Беларусь у рамках Нямецкага тыдня. Ейны візыт арганізавала польскае прадстаўніцтва фонду Конрада Адэнаўэра, які ёсьць «партыйным» фондам ХДС-ХСС. У Міжнародным адукацыйным цэнтры яна прачытала лекцыю «Працэс трансфармацыі ў былой НДР» і дала прэсканфэрэнцыю.

На лекцыю сабраўся ня толькі палітычны «бамонд» дэмпартыяў (Вячорка, Статкевіч, Дабравольскі, Янукевіч, Раманчук, Стужынская), але і «афіцыёз» (дэкан факультэту міжнародных адносінаў БДУ Аляксандар Шарапа). Было багата гісторыкаў (Сагановіч, Голубеў) і журналістаў (Фядута, Карбалевіч).

Лекцыя нямецкай дэпутаткі была не звычайным сухім навукападобным пералікам рэарганізаваных прадпрыемстваў, сумаў капіталаўкладаньня, лічбаў беспрацоўя і росту валавога прадукту. Спн.Клаўдыя распавядала пра тое, што бачыла на ўласныя вочы: яна сама жыла ў НДР аж да зьяднаньня з ФРН.

Натуральна, працэс улучэньня НДР у эўрапейскую прастору розьніўся ад падобных працэсаў у іншых краінах сацыялістычнага лягеру: Усходняя Нямеччына мела падтрымку ня толькі ад міжнародных структураў, але й ад заходняй часткі краіны. Але немцы з усходу, як адзначыла спн.Нольтэ, нават не ўяўлялі, наколькі іхная прамысловасьць не дапасаваная да рынкавых умоў існаваньня.

Вялікім дасягненьнем сацыяльных зьменаў гэтых гадоў дэпутатка Бундэстагу назвала зьяўленьне і ўмацаваньне незалежных СМІ і судоў: «Спадзяюся, яны ўжо ніколі не вернуцца ў той стан, які быў пры камуністах». Дадатна ацаніла яна адсутнасьць таварнага дэфіцыту ў крамах былой НДР і дэмілітарызацыю грамадства: у школах НДР выкладалі прадмет, аналягічны нашай «пачатковай ваеннай падрыхтоўцы», а ўсе юнакі-студэнты ВНУ мусілі станавіцца афіцэрамі запасу. Рэформы павялічылі працягласьць жыцьця: жыхары НДР жылі на 3 гады менш, чым грамадзяне Заходняй Нямеччыны. Цяпер гэтыя межы зраўняліся: жанчыны жывуць у сярэднім 81 год, мужчыны — 79.

Рэфармаваньне ўсходненямецкай сыстэмы, паводле слоў спн.Нольтэ, не было абсалютнай панацэяй. З Усходняй Нямеччыны пачала эміграваць моладзь — ёсьць мясцовасьці, населеныя адно старымі. ФРН мае больш бюракратычную сыстэму, чым мела нават НДР. Павелічэньне жыцьцёвага веку атрымала адмоўную «кампэнсацыю» ў скарачэньні нараджальнасьці: цяпер на адну жанчыну ў Нямеччыне прыпадае 1,3 дзіцяці. А з 2006 г. школы краіны зазнаюць крызыс, бо дзяцей будзе не ставаць.

Аднак спн.Клаўдыя лічыць, што ўсе гэтыя праблемы можна вырашыць у рамках цяперашняй дэмакратычнай сыстэмы Нямеччыны: «Свабода не гарантуе высокага жыцьцёвага ўзроўню. Але безь яе ўсё іншае ня мае сэнсу».

Натуральна, што зь беларускага боку вялікую цікавасьць выклікалі ня столькі нямецкія праблемы, колькі міжнародны розгалас нашых. Наконт пэрспэктыў уваходу Беларусі ў Эўразьвяз спн.Нольтэ выказалася пазытыўна: «Беларусь, Украіна, Малдова бліжэйшыя да цэнтру Эўропы, чым Турцыя!» Яна адзначыла, што для набліжэньня да Эўразьвязу трэба, каб і зь беларускага боку былі зробленыя пэўныя крокі.

Зь іншага боку, дэпутатка Бундэстагу зазначыла, што й эўрапейскі бок зважае на традыцыі, якія мае грамадзтва той ці іншай краіны. У прыватнасьці, немцы, у якіх моцна разьвітая сыстэма сацыяльнай абароны, высока цэняць нашу ўнутраную палітыку, арыентаваную на сацыяльную роўнасьць слаёў: «Мы ведаем, што ў вас моцная адукацыйная сыстэма. І з павагай ставімся да таго, што ваш прэзыдэнт хоча даць роўныя магчымасьці для паступленьня ў ВНУ выхадцам зь вёскі й гараджанам».

**Аркадзь Шанскі**

# За кватэру плацім па-эўрапейску

**Беларусы выдаткоўваюць на камунальныя паслугі чвэрць сваіх даходаў. Найбольш рэзкі скачок камуналкі прыпадзе на 2007 год. Урад прадугледжвае стопрацэнтную прыватызацыю ЖКГ, домаўладаньня, домаабслугоўваньня, гатэляў і лазьняў.**

Галоўнай задачай ЖКГ Беларусі зьяўляецца «забесьпячэньне фінансаваньня яе ўзнаўленьня». Таму сума ў жыроўках беларусаў працягвае ўзрастаць. Акрамя таго, дзяржава шукае шляхоў рэфармаваньня галіны, спрабуючы перадаць правы на абслугоўваньне жылога фонду прыватнікам ці таварыствам уласьнікаў жыльля. На гэты год нават было запланавана акцыянаваць 50% ЖЭСаў у Беларусі. Як бачым, вынікаў гэта не дало. Прычынаў урад бачыць дзьве: непадрыхтаванасьць беларусаў перайсьці да прыватнага кіраваньня жыльлём і страх перад рэзкім павышэньнем тарыфаў «прыватызаванымі» ЖЭСамі.

## Прыватызаваны ЖЭС

На сёньня структурамі, што забясьпечваюць кіраваньне і абслугоўваньне сферы ЖКГ на месцах, зьяўляюцца ЖЭСы і ЖРЭУ. У Канцэпцыі разьвіцьця ЖКГ адным зь першых кірункаў рэфармаваньня галіны значыцца дэманапалізацыя гэтага сэктару. Фактычна — штучнае стварэньне канкурэнтнага асяродзьдзя.

Сярод першых мераў рэформы — падзел улады паміж ЖЭСамі і ЖРЭУ. За першымі застануцца тэхнічныя паслугі (праца сантэхнікаў, дворнікаў), а ЖРЭУ будуць весьці ўсе фінансавыя справы. Пазьней гэтую структуру плянуюць замяніць на разьліковa-касавыя цэнтры. Яшчэ адна форма ўласнасьці — таварыствы ўласьнікаў жыльля (ТУЖ). Аднак пакуль прадукцыйнасьць іх працы мінімальная. Усяго іх крыху болей за 200 на краіну, дый яны не выпрацавалі яшчэ сыстэмы функцыянаваньня.

Напрыклад, у новазбудаваным шматпавярховіку ў менскім Красным Бары жыхары ўжо з паўгоду ня могуць прапісацца і наладзіць сыстэму абслугоўваньня праз адсутнасьць домакіраўніка і бухгальтара ў ТУЖ. «Калі мы выбіраем людзей, то яны проста не вытрымліваюць сваіх абавязкаў, а часам і падманваюць. Жыхары ж зьбіраюць грошы ім на заробак, а таксама на найманьне сантэхніка ды дворніка. А грошы якраз у іх руках», — скардзіцца адна з жыхарак дому. Адсюль адна з галоўных праблем ТУЖ — адсутнасьць падрыхтаваных кадраў і традыцый для правядзеньня альтэрнатыўнага домаўладаньня.

## Папулісцкі графік

Паводле Канцэпцыі разьвіцьця ЖКГ, не пазьней за 2015 г. беларусы будуць аплачваць камунальныя паслугі поўнасьцю. Цяпер гэтая лічба складае прыкладна 60%, або 25% ад сярэдняга сукупнага даходу беларускай сям’і. Налета, паводле праекту бюджэту, за паслугі ЖКГ будзем плаціць 57%, астатняе — за дзяржавай. Паводле слоў прэзыдэнта, на 2005 г. меркавалася запланаваць, што 70% за паслугі ЖКГ мусіць плаціць насельніцтва, аднак у выніку ягонага ўмяшаньня лічба аказалася роўнай 57% — на тры адсоткі меней, чым сёлета. Набліжаецца рэфэрэндум, таму лічба мае і папулісцкае адценьне. Як і 4—5 даляраў, на якія прэзыдэнт дазволіў падвышаць аплату ў жыльлёва-камунальнай галіне для насельніцтва. Лічачы штучнае тармажэньне разьвіцьця цэнавай палітыкі доўгі час малаімаверным, можна чакаць рэзкага скачка аплаты пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. Інакш ня будзе зрэалізавана Канцэпцыя разьвіцьця ЖКГ.

## Хто даплачвае за нас

Згодна зь сёлетнім бюджэтам, былі створаны мясцовыя мэтавыя жыльлёва-інвэстыцыйныя фонды. Іх даходамі сёлета пакрываецца да 15% платы за камунальныя паслугі. Да 65% сродкаў, атрыманых гэтымі структурамі, ідзе на фінансаваньне абслугоўваньня і рамонту жылога фонду. У жыльлёва-інвэстыцыйныя фонды адлічваюць 1,15% ад свайго прыбытку камэрцыйныя банкі, гандлёвыя і нарыхтоўчыя арганізацыі, прадпрыемствы харчаваньня і страхавыя кампаніі. Налета гэтыя арганізацыі будуць плаціць адзіны збор у памеры 2,75% ад прыбытку. Зь яго 55% пойдзе ў фонд падтрымкі сельскагаспадарчых вытворцаў, 27% — у дарожныя фонды і толькі 18% — на фармаваньне збору па фінансаваньні абслугоўваньня і рамонту жылога фонду. Аднак дзейнасьць гэтага фонду плянуецца згарнуць пасьля 2006 г.

25% (20% налета) ад кошту камунальных паслуг насельніцтву ў абласьцях і 10% у Менску пакрываецца зь мясцовых бюджэтаў.

Аднак такая сытуацыя часовая. Урад прадугледжвае стопрацэнтную прыватызацыю ЖКГ, домаўладаньня, домаабслугоўваньня, гатэляў і лазьняў за пэрыяд з 2006 да 2015 г. з адначасовым ростам долі камунальных коштаў, якія пакрываюцца насельніцтвам. Калі праграма будзе выкананая, праз дзесяць гадоў ЖКГ цалкам пяройдзе на рынкавыя рэйкі, а прыбыткі ад яе абслугоўваньня будуць трапляць у кішэню прыватнікаў.

**Сяргей Трафілаў**

## Рэфармаваньне ЖКГ

**Першы этап — 2004—2006**

дзяржрэгуляваньне платы за камунальныя паслугі; стварэньне ўмоў для канкурэнцыі ў абслугоўваньні жылога фонду; абсталяваньне дамоў з больш чым дваццацьцю кватэрамі лічыльнікамі вады і цяпла.

**Другі этап — 2006—2010**

прыватызацыя ЖКГ: 70% жылога фонду абслугоўваецца прыватнымі структурамі; забесьпячэньне інжынэрнай інфраструктурай сельскай мясцовасьці; прыватызацыя гатэляў і лазьняў.

**Трэці этап — 2010—2015**

100% прыватнага домаўладаньня і домаабслугоўваньня; 100% аплаты за паслугі ЖКГ насельніцтвам; страхаваньне жылога фонду.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Гарантаваныя сацыяльныя стандарты

На камунальныя паслугі сярэдняя сям’я мусіць затрачваць ня больш за 25% ад сукупнага даходу;

расход вады мусіць складаць 180 літраў у суткі на чалавека, зь якіх 90 л — гарачая;

50 градусаў — тэмпэратура гарачай вады;

18 градусаў — нарматыў ацяпленьня жылых памяшканьняў.

## Сярэдні заробак і сярэдні кошт камуналкі, $

| | Беларусь | Польшча, Беласток | Літва, Вільня |
|---|---|---|---|
| Настаўнік | 130 | 320 | 380 |
| Пэнсіянэр | 70 | 200 | 180 |
| Будаўнік-рабочы | 180 | 430 (рабочы) | 510 |
| Кошт камунальных паслуг (за 3-пакаёвую кватэру ўзімку) | 50 | 140 | 150 |

# Не на тых напалі



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Скончыліся вучэньні «Шчыт Айчыны — 2004». Сярод задачаў, якія ставіліся перад беларускім войскам сёлета, — рэпэтыцыя ўдзелу ў міратворчай апэрацыі на тэрыторыі суседняй дзяржавы, хоць Канстытуцыя забараняе пасылаць беларускія войскі за мяжу. Таксама адпрацоўвалася апэрацыя «па лякалізацыі і зьнішчэньні незаконных бандфармаваньняў», хоць такіх у Беларусі не было з партызанскіх часоў. Між тым ніхто не адпрацоўвае варыянтаў рэагаваньня на выпадак цалкам рэальнай пагрозы сувэрэнітэту і тэрытарыяльнай цэласьці краіны з боку «саюзнай дзяржавы». Ад вучэньняў было многа шуму й дыму, ды мала практычнай карысьці.**

## Тры кандыдаты — тры шляхі

У Полацку сустрэчы з кандыдатамі адбываюцца ў школах ва ўсіх мікрараёнах. Ходзяць на гэтыя сустрэчы людзі неахвотна, настаўнікі ж вымушаны прысутнічаць на іх па загадзе. Вэртыкаль падтрымлівае цяперашняга дэпутата Ўладзімера Ісаева. Кансэрватыўны электарат, які настальгуе па СССР, атрымаў кандыдата ад ПКБ, былога вайскоўца-палітработніка Леаніда Карпішына. Дэмакратычна скіраваныя выбарцы, пераважна моладзь, будуць галасаваць за свайго прадстаўніка — настаўніцу беларускай мовы Алену Сом. На сустрэчах з кандыдатамі віруюць сапраўдныя жарсьці. Давераная асоба А.Сом Антось Мядзьвецкі спытаў у цяперашняга дэпутата: калі парлямэнт кантралюе выкананьне бюджэту краіны, дык ці галасаваў ён, дэпутат ад Полацку, за набыцьцё прэзыдэнту новага самалёта «Боінг»? Дэпутат Ісаеў блытана адказаў, што «Боінгі» набываліся толькі для патрэб авіякампаніі «Белавія», што выклікала сьмех у залі.

Супраць рэфэрэндуму агітуюць і А.Сом, і Л.Карпішын. Заўважана, што на ўсіх сустрэчах прысутнічаюць людзі, якія распаўсюджваюць плёткі пра апазыцыянэраў-кандыдатаў: маўляў, ведаю я яго (яе), жыву ў адным пад'езьдзе… Стары агідны мэтад.

**Тамаш Гурба, Полацак**

## Пра што цьвітуць каштаны

Прырода падкінула гамельчукам падарунак — у цэнтры гораду зноўку зацьвілі каштаны. Відавочная анамалія вэгетацыі тлумачыцца ўзьдзеяньнем на дрэвы ўрбаністычнага асяродзьдзя са сваімі многімі, нярэдка заганнымі асаблівасьцямі. Даўней, калі адбывалася няўчаснае цьвіценьне садоў, летапісцы сьледам за паспалітым людам бачылі ў такой прачве кепскі знак.

## Дайшлі рукі да ракі

Тыя, хто апошні месяц шпацыраваў ля сожаўскай пабярэжніцы, проста ня мог абмінуць вокам гіганцкія ржавыя віціны-баржы. У іх паціхупатроху загружаўся рачны пясок і сьмецьце, якія падымаліся з дна ракі. Ёсьць надзея, што Сож у выніку гэтай «апэрацыі» хоць трохі пачысьцее і папрыгажэе. Характэрны зялёны колер вады і балотны пах пасьпеў надакучыць.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## ЦЭЦ на дровах

Першая міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва будзе пабудавана ў Асіповічах у 2005 г. Магутнасьць станцыі складзе парадку 15—17 МВт. Першапачаткова станцыя зможа забясьпечваць цеплаэнэргіяй частку гораду. Высокі кошт дастаўкі біяпаліва на такія станцыі зьяўляецца асноўнай праблемай у рэалізацыі праекту.

**City.mogilev.by**

## Гарматы на сьметніку

Жыхар Паставаў на гарадзкім сьметніку адшукаў сапраўдную авіяцыйную гармату. Былы вайсковец небясьпечную рэч адвёз дадому і паведаміў аб ёй у праваахоўныя органы. Гэта ня першая падобная знаходка. За савецкім часам каля райцэнтру знаходзіўся вайсковы аэрадром і тут дысьлякаваліся два авіяцыйныя палкі. Да сёньня, дзякуючы падобным знаходкам, памяць пра вайсковых лётчыкаў у Паставах жыве.

## Рыхтуем храм для Мэльпамэны

8 кастрычніка ў Полацку прэм'ерным спэктаклем «Плошча Перамогі» (рэжысэр-пастаноўшчык Віталь Баркоўскі, аўтар п'есы Алена Папова) урачыста адкрыецца тэатральны сэзон 2004/05. Тры гады таму ў старой крыўскай сталіцы была створаная філія віцебскага Тэатру імя Якуба Коласа. Тым часам рыхтуецца стварэньне мясцовага калектыву: зь ліку палачан набрана тэатральная студыя і будучыя акторы пачынаюць завочна навучацца ў Акадэміі мастацтваў і аднычасова ў самых «коласаўцаў». Мастацкі кіраўнік драмтэатру В.Баркоўскі сказаў, што тэатральныя калектывы ў сьвеце спаборнічаюць, як спартоўцы. Апошнім часам істотны прарыў у тэатральным мастацтве зьдзейснілі літоўцы і ўкраінцы, іх посьпехі атрымалі міжнароднае прызнаньне. Таму палачанам трэба арыентавацца на найлепшыя сусьветныя ўзоры, а Полацак варты таго, каб мець уласны тэатр міжнароднага ўзроўню. І, вядома, тэатар мусіць быць нацыянальным, адзначыў Баркоўскі.

Рыхтуецца і полацкая гарадзкая ўлада — ужо набыта адмысловае тэатральнае сьветлавое абсталяваньне, а ў наступным годзе пройдзе рэканструкцыя залі ГДК: яна набудзе клясычныя тэатральныя формы — з партэрам і бэльэтажам.

## «Народный предприниматель» не зьбіраецца прыпыняцца

1 кастрычніка рэдактар газэты «Народный предприниматель» навапалачанін Валер Шаўчэнка атрымаў ліст зь Міністэрства інфармацыі. У ім знаходзіліся два дакумэнты — папярэджаньне аб парушэньні Закону аб друку і загад аб прыпыненьні выхаду газэты на тры месяцы. Гэтае папярэджаньне — першае, якое атрымаў «Народный предприниматель» за ўсе гады свайго існаваньня (а газэта выходзіць з 2000 г.), таму незразумела, чаму адразу было вынесена пакараньне. Апошнім часам праз фінансавыя праблемы пэрыёдык друкаваўся толькі раз на месяц, а распаўсюджваўся бясплатна па ўсёй краіне сярод сяброў прафсаюзу прыватных прадпрымальнікаў. Галоўны рэдактар таксама адзначыў, што не зьбіраецца прыпыняць выданьне «Народного предпринимателя», але цяпер гэта будзе бюлетэнь рэгіянальнай арганізацыі прадпрымальнікаў Беларускага незалежнага прафсаюзу, якую ачольвае сам Валер Шаўчэнка.

**ВК, Полацак**

## Расейскае кіно ня ў модзе

Нашумелы расейскі фільм «Начная варта» ажыятажу ў гледачоў ня выклікаў, за чатыры дні фільм прагледзелі ўсяго 670 чалавек. Для параўнаньня: прэм'ера «Пакутаў Хрыстовых» сабрала 1500 случакоў, хоць адзьнятыя па-галівудзку жорстка сцэны пакутаў сына Божага перад укрыжаваньнем некаторых гледачоў прымусілі ўжываць валідол.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

# Нацэлены на перамогу

Самым вядомым спартоўцам на Полаччыне зьяўляецца Ігар Нікіцін. Цяпер яму 54 гады, але ён па-ранейшаму штогод прысьвячае свайму роднаму Полацку новыя перамогі.

Са школы Ігар быў аматарам спорту: чэмпіён Полацку па плаваньні, гуляў за зборную Віцебскай вобласьці ў баскетбол. Не спыніў заняткаў спортам і пасьля прызыву ў войска. Але здарылася непапраўнае. На адной з трэніровак чэмпіянату Ўзброеных Сіл па баскетболе Нікіцін атрымаў траўму шыйнага пазванка. У выніку — інваліднасьць першай групы.

Нават гэткае выпрабаваньне лёсам не зламіла Нікіціна. Вось ужо 30 гадоў, прыкаваны да інваліднай каляскі, ён штодзень выкочваецца са свайго пад'езду на трэніроўку, падчас якой лёгка адольвае 30—40 кілямэтраў.

Нікіцін — шматразовы чэмпіён Беларусі па гонках на інвалідных вазках, пераможца шматлікіх міжнародных спаборніцтваў. Сёлета ў верасьні ён заняў чацьвёртае места на бэрлінскім марафоне. Аднак у Афіны на Параалімпійскія гульні ён не патрапіў. Беларускіх гоншчыкаў-калясачнікаў увогуле на алімпіяду не ўзялі. Нікіцін з тае прычыны моцна пакрыўдзіўся. Кажа, гэта адбылося таму, што ва ўсім сьвеце гоншчыкі-калясачнікі спаборнічаюць на адмысловых спартовых калясках, а ў Беларусі іх няма, спаборніцтвы ў нас праводзяць на звычайных. Зразумела, добрых вынікаў на іх не пакажаш. Каб выйсьці на міжнародны ўзровень, Нікіцін з дапамогай спонсараў і за ўласныя грошы набыў спартовую каляску. Але цяпер ён удзельнічае ў чэмпіянатах Беларусі па-за пратакольным залікам. Сэнс у такіх спаборніцтвах канчаткова зьнік, а каб удзельнічаць у замежных — няма спонсара.

Нікіцін, аднак, не здаецца. Ён ставіць рэкорд за рэкордам. У 1997 г. палачанін на адных руках праплыў па Дзьвіне за 2 гадзіны 57 хвілін з Полацку ў Наваполацак — а гэта больш як восем кілямэтраў у халоднай 18-градуснай вадзе. Затым Нікіцін за гадзіну падняў 20 тонаў 150 кіляграмаў: лежачы адціскаў дзьве 5-кіляграмовыя гантэлі. Затым за пяць хвілін падняў 183 разы дзьве 10-кіляграмовыя гантэлі. На рэспубліканскім спаборніцтве за пяць хвілін ён выціснуў 83 разы гантэлі агульнай масай 33,5 кг. Нікіцін кажа, што як гоншчыку-калясачніку яму няма роўных ані ў Беларусі, ані ў Расеі, ані ў Польшчы. Ён спадзяецца, што на Параалімпійскія гульні ў Кітай ён абавязкова трапіць.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Гуд-бай, Ленін, хай, Гітлер

## ГДР ад камунізму да нацызму

Лёлік Ушкін

Да сёлетняга 3 кастрычніка, дня аб'яднаньня Нямеччыны, усходнія немцы зноў падкалі кіраўнікам краіны сьвінюку — прагаласавалі за нэанацыстаў. Тое, што інкарпарацыя былой ГДР у склад ФРГ будзе балючай, разумелі ўсе. З кожных 43 беспрацоўных у Германіі 15 жывуць у т.зв. новых землях. Заробкі тут храновыя, беспрацоўе высокае. 21% «усходнікаў» жадаюць рэстаўрацыі Бэрлінскай сьцяны і ў прыпадку нянавісьці да «вэсі» галасуюць за розных экстрэмістаў.

Раней модным сродкам паказаць фігу чыноўнікам у Бэрліне было галасаваньне за анфан-тэрыбля нямецкай палітыкі — Партыю дэмакратычнага сацыялізму (ПДС), спадкаемку Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі. Аднак у апошнія гады з ПДС адбылася цікавая мэтамарфоза. Пасьля выхаду на экраны славутай стужкі «Гуд-бай, Ленін» у масавай сьвядомасьці Германская Дэмакратычная Рэспубліка з краіны сумнага рэалсацыялізму ператварылася ў краіну-кітч накшталт краіны каўбоя Мальбара. Атрыбутыка ГДР — напрыклад, блакітныя Т-шырты з лэйбам хонэкераўскага камсамолу FDJ — пазбавілася ўсялякага правацыйнага падтэксту.

Што да самой ПДС, то з прыходам да кіраўніцтва фракцыі Лётара Біскі партыя паружавела і за мілую душу згодна праводзіць любыя лібэральныя рэформы. Незадаволеным уніяй з ФРГ усходнім немцам нічога не засталося, як шукаць новых формаў помсты. Іх і прапанавалі нэанацысты. Калі ўлетку пачаліся гучныя пратэсты супраць новага антысацыяльнага закону «Harz-4», праварадыкалы масава выйшлі на вуліцы, зрабілі сабе надрэнны прамоўшн і на верасьнёўскіх выбарах у землях Брандэнбург і Саксонія пралезьлі ў ляндтагі — рэгіянальныя парлямэнты.

У зямлі Брандэнбург Нямецкі народны саюз (ННС) — дзецішча доктара Герхарда Фрая — атрымаў 5,4%. У Саксоніі Нацыянал-дэмакратычная партыя (НДП) — 9%. Абедзьве тусоўкі ўяўляюць сабой прыкольныя экспанаты нямецкай палітычнай кунсткамэры. Кар'ера Фрая пачалася ў 50-х у Мюнхэне, калі да яго, маладога прадпрымальніка, завалілася купка старых афіцэраў Вэрмахту ды СС і прапанавала стаць мэнэджэрам іх праекту — газэты «Deutsche Nationalzeitung» («Нямецкай нацыянальнай газэты»). Фрай зрабіў выданьне супэррэнтабэльным і, натуральна, прыйшоў да высновы, што старыя казлы яго ня цэняць. Павышыбаўшы з рэдакцыі вэтэранаў-кампаньёнаў, амбіцыйны Фрай вырашыў узначаліць увесь нацысцкі рух. Ужо на пачатку 70-х у яго склаўся імідж карычневага Савы Марозава — мільянэра, што паехаў на нацызьме.

Вакол Фрая апэратыўна ўзьнікла, кажучы сучасным палітжаргонам, цэлая банда грантасосаў — «Gemeinschaft zum Schutz der Frontsoldaten», «Volksbewegung füer Generalamnistie», «Deutsche Schutzbund füer Folk und Kultur». Большая частка гэтых праектаў — нешта сярэдняе паміж ніўрадавымі ініцыятывамі і культурнымі асяродкамі. Аднак добры доктар не цураўся адшпільваць і калдырным нацы. У 1976 г. ён са сваёй кішэні праплаціў штраф «Вайскова-спартыўнай групоўкі Гофмана». У 1988 г. дапамагаў знайсьці адваката для вядомага рэвізіяніста Тыза Хрыстфэрсана — аўтара бэстсэлеру «Падман Галакосту». Недзе ў сярэдзіне 70-х сварка з НДП прывяла да думкі стварыць асобную партыю — Нямецкі народны саюз. Электаральная тактыка ННС простая — зас..ць усе сьцены сваімі постэрамі. Часам гэта дае прыстойныя вынікі. У 1998 г. у Саксоніі-Ангальт за ННС аддалі галасы 13% выбаршчыкаў, у 1999 г. у Брандэнбургу партыя, набраўшы 5,3% , прайшла ў ляндтаг.

Яшчэ цікавейшыя перцы згрупаваліся ў НДП. Калі ў 2000 г. дырэктар нямецкага МУС Ота Шылі (дарэчы, былы адкакат левых тэрарыстаў з Фракцыі Чырвонай Арміі — РАФ) ініцыяваў працэс забароны партыі, выявілася, што добрая палова кіраўнікоў НДП — завэрбаваныя «Службай аховы Канстытуцыі» стукачы. Сама партыя была створана з ініцыятывы спэцслужбаў — лепш не сачыць за кожным нэанацыстам, а сабраць усіх да адзінай кучы і кантраляваць цэнтралізавана.

Зоркавы час партыі прыпаў на другую палову 60-х, калі ёй руліў харызматычны Адольф фон Тадэн. У той час хрысьціянскія дэмакраты ўвайшлі ў «вялікую кааліцыю» з сэдэкамі Бранта, і расчараванае правае крыло ХДС зьвярнула свае погляды на НДП. За пару гадоў нацыянал-дэмакраты пралезьлі ў сем ляндтагаў, а ў 1969 г. не дабралі 0,7%, каб увайсьці ў Бундэстаг. Аднак халява хутка скончылася. З прыходам да ўлады сацыял-лібэральнай кааліцыі ХДС заняў нішу правай апазіцыі, а НДП пачала маргіналізавацца. Дынаміка электаральнага ўраджаю, зьбіранага НДП: 1990 — 0,31%, 1998 — 0,26%, 2002 — 0,4%. Зь сярэдзіны 70-х колькасьць сяброў партыі не перавышае 6000 чалавек, партыя перажыла некалькі расколаў. Сам фон Тадэн плюнуў на гэтую дурную справу. Аднак у 90-я гады ў партыю ламануліся скінхэды-алігафрэны, якія забілі на кар'еру і адукацыю, і нечакана нават для сябе НДП стала адзінай праварадыкальнай партыяй, якая ведае пароль доступу да моладзевых субкультур. Прапагандысты НДП не бубняць нэафітам пра сіёнскую закулісу або пакутніка арыйскай расы Геса, а проста раскручваюць моду на афігенныя боты «Dr.Martens» ці правы рок. Сэнсу песень за завесай рок-дэцыбэлаў падлетак не разумее, аднак прасякае, што быць нацы — ку-у-ул!

Цікавасьць да НДП узьняла і каларытная асоба Горста Малера — былога баевіка РАФ. За арганізацыю тэрактаў, кіднэпінг буржуяў, забойства палітыкаў ХДС і вайскоўцаў NATO Хорста засадзілі за краты амаль на 10 гадоў. Разам з амністыяй яму стукнула шыза, што тэрор левакоў РАФ быў накіраваны ня супраць капіталізму, а супраць акупацыі Германіі заходнімі саюзнікамі. Цяпер Малер — сябар НДП, і, магчыма, хутка мы ўбачым яго ў якасьці дэпутата ляндтагу.

Між тым і самі нэанацысты, і проста палітолягі спрабуюць зразумець, што адбылося 24 верасьня ў дзьвюх усходненямецкіх землях — нацыянальная рэвалюцыя або пратэставае галасаваньне. Большасьць лічыць, што меў месца проста пратэст супраць партыйнага істэблішмэнту з СДПГ і ХДС, якія займаюць фактычна аднолькавыя пазыцыі па сацыяльных пытаньнях. Паказальнае інтэрвію Олафа Фахрэнхольда, кіраўніка аддзелу па барацьбе з правым радыкалізмам у Службе аховы Канстытуцыі, часопісу «Freitag». Чыноўнік лічыць, што няма сэнсу ініцыяваць забарону НДП або ННС, бо электарат галасаваў з сацыяльна-эканамічных прычын. Якая можа быць нацыянальная рэвалюцыя, калі ў электаральных бастыёнах ультраправых, накшталт т.зв. Саксонскай Швайцарыі, амаль няма іншаземцаў-імігрантаў.

Гісторыя сьведчыць, што ў парлямэнтах нэанацысты надоўга не прасіжваюць: ім абы морды біць, а ня нудныя законы пісаць. Парлямэнцкая адысэя ННС у Саксоніі-Ангальт скончылася тым, што дэпутаты-нэанацысты пасварыліся і фракцыя развалілася. Самі партыі яднаюць прыхільнікаў самых розных поглядаў. Напрыклад, друкаваны орган НДП «Deutsche Stimme» б'е ў набат: маладыя немцы п'юць зашмат піва.

Самі праварадыкалы імкнуцца давесьці адваротнае. Лідэр НДП Уда Фойгт у газэце «Junge Freihat» заявіў, што за НДП галасавалі зь іншых прычынаў, бо немцы незадаволеныя палітыкай нацыянальнай дэкаранізацыі і яе праваднікамі — старымі партыямі, якія танчаць пад дудy міжнароднага капіталу. Альтэрнатыва, паводле Фойгта, — моцная нацыянальная дзяржава, за якую і будзе змагацца НДП.

Якою можа быць «нацыянальная дзяржава» ва ўмовах глябалізацыі, да канца не зразумела. І, здаецца, што гэта ідэя з таго ж шэрагу, што і Бацькаў рынкавы сацыялізм.

Куды больш цікавыя высновы нямецкіх інтэлектуалаў: галоўная пагроза для Германіі — палітычная манаполія нэанацыстаў на эксплюатацыю вобразу Гітлера. Паказальна, што посьпеху ННС і НДП ускосна спрыяў выхад на экраны ў пачатку восені фільму «Der Untergang» , які за першы ўік-энд сабраў сто тысяч гледачоў. Фільм апавядае пра апошнія часы Гітлера ў яго славутым бункеры і, калі меркаваць паводле рэцэнзій крытыкаў, па шкале мастацкай вартасьці цягне на троечку. Але народ проста табунамі валіў у кінатэатры. Бо Гітлер — цэлая індустрыя ў сучасным сьвеце. Як казаў мне адзін бэрлінскі выдавец, калі ў яго часопісу падае наклад і прыходзяць цяжкія часы, яны цiскаюць нешта пра Гітлера: Гітлер — брат Сталіна, Гітлер — іншаплянэцянін, Гітлер — вуаерыст. Усё ідзе на ўра. «Мы ўсе жывём у цені Гітлера», — змрочна канстатуе аналітык лібэральнага выданьня «Die Zeit» Енс Есэн.

Антыгітлераўская прапаганда зьнішчыла нацызм як масавы рух, аднак зрабіла з Гітлера сынонім немцаў, а самога Адольфа — маскультавай асобай накшталт Напалеона. Відавочна, што нямецкія палітыкі і саюзнікі прапусьцілі час нармалізацыі, «не зьнялі своечасова наморднік», як пажартаваў некалі нябожчык-рэдактар «Шпігелю» Рудольф Аўгенштайн. У выніку першым немцам XX ст. так і застаецца ашалелы фюрэр, а ўсе немцы, як сказала Ганна Арэнт, — «роўныя ў сваёй вінаватасьці». Гэта бомба запаволенага дзеяньня. Рэзюмэ аналітыкаў — трэба дэмістыфікаваць асобу Алаізавіча, магчыма, як гэта зрабілі са Сталіным і Леніным у Расеі. Але як зрабіць гэта, не парушыўшы ўнутранага міру ў краіне, і перш за ўсё — ня выклікаўшы пратэстаў у суседзяў, дзе «фармальны антыфашызм» стаў часткай дзяржаўнай ідэалёгіі?.. Я, прынамсі, ня ведаю.




«Гітлер — наша апошняя надзея». Перадвыбарчы плякат 1933 г.



**Прапагандысты НДП проста раскручваюць моду на афігенныя боты «Dr.Martens» ці правы рок. Сэнсу песень за завесай рок-дэцыбэлаў падлетак не разумее, аднак прасякае, што быць нацы — ку-у-ул!**




**У зямлі Брандэнбург нэанацысцкі Нямецкі народны саюз атрымаў 5,4%. У Саксоніі Нацыянал-дэмакратычная партыя — 9%.**

# Шчасьце чытаць

Барыс Пятровіч.
Шчасьце быць... — Менск:
Тэхнапрынт, 2004. — 576 с.

*Паверце клясыкам – яны маняць.*
Барыс Пятровіч

У творчасьці Барыса Пятровіча — гісторыя пакаленьня літаратараў, што сталіся сьведкамі самаразбурэньня імпэрыі падчас росквіту сваіх творчых сіл. Савецкая рэчаіснасьць, выяўленая найлепшымі прадстаўнікамі гэтага пакаленьня, побач з абсурднасьцю «Залюстроўя» можа набываць адзнакі чароўнасьці. Сапраўдны майстра сягае далей за проста выяўленьне, пераствараючы гэтую рэчаіснасьць.

Проза Барыса Пятровіча зьявілася раней за фармаваньне кантэксту, у які б яна здолела ўпісацца. У час, калі большасьць аўтараў у чарговы раз займаліся сьцьвярджэньнем даволі абстрактных ідэалаў «нацыянальнай ідэі», Барыс Пятровіч ствараў свае абстракцыі, намагаючыся выцягнуць беларуськую-ру на якасна *іншы* ровень. Як усялякі першапраходнік, ён ня стаўся «клясыкам жанру». Для тых, хто шукаў выйсьце праз комін ці акно, ён паказаў дзьверы.

Да многіх тэкстаў Барыса Пятровіча падаецца прыдатным эпіграф з Гесэ: «Толькі для вар'ятаў». Кнігу «Шчасьце быць…» не рэкамэндуецца чытаць нагбом. Для яе чытаньня няма картасараўскай «інструкцыі», кожны мусіць выпрацаваць свой «маршрут». Невялічкія, пачуцьцёва ёмістыя арыгінальныя жанры «фрэскі» й «трызьненьні» сюжэтна маглі б стацца аповесьцямі, калі не раманамі. Высокі ўзровень афарыстычнасьці дасягнуты ў «мроях», што адсылаюць да знакамітых «дзэнаўскіх гісторый». Гратэскавыя «піліпікі» пачатку 90-х зьяўляюцца непераўзыдзеным прататыпам «Сабачых гісторый». Аповесьць «Пуціна» (2003) — самы буйны паводле памеру твор Барыса Пятровіча, хаця й напісаны адным сказам, — уяўляе сабой узор лірычнае прозы.

Новая кніга Барыса Пятровіча — свайго роду «The best of» з напісанага аўтарам за 16 гадоў. Трымаючы ў руках гэтую таміну, пачуваешся мэлямам, што гадамі па драбніцах зьбіраў рарытэтныя запісы (а добрай прозы, як і добрай музыкі, у нас заўжды бракуе) — і атрымаў амаль усё на адным дыску.

**Анатоль Івашчанка**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Элемэнты нацыянальнай бясьпекі

**Дзяржлітаратары пра новую культурную сытуацыю.**

Напярэдадні падпіснога сэзону кіраўніцтва холдынгу «Літаратура і мастацтва» сустрэлася з журналістамі. Дэлегацыю з холдынгу ў складзе Таісы Бондар, Міколы Мятліцкага і Раісы Баравіковай дапаўнялі дырэктар радыёстанцыі «Беларусь» паэт Навум Гальпяровіч, галоўны рэдактар «Мастацкай літаратуры» празаік Віктар Праўдзін, галоўны рэдактар «Беларусьфільму» Георгі Марчук і старшыня хуткага гатаваньня Менскай гарадзкой пісьменьніцкай арганізацыі паэт Павал Вараб'ёў.

М.Мятліцкі адзначыў, што самая страшная пагроза сёньняшняму сьвету — «антычалавечнасьць і амэрыканізацыя», якую нясе Галівуд. П.Вараб'ёў адзначыўся тлумачэньнем, што літаратура павінна стаць «культурным элемэнтам нацыянальнай бясьпекі».

В.Праўдзін засяродзіўся на выдавецкіх праектах. Да 75-годзьдзя Караткевіча (2005) мае выйсьці жыцьцяпіс пісьменьніка ў сэрыі «Жыцьцё знакамітых людзей». Пра сувязь кінэматографу зь беларускай літаратурай расказаў Г.Марчук: ужо гатовы сцэнар паводле Караткевічавай «Ладзьдзі роспачы», а таксама рыхтуюцца кінапастаноўкі паводле паэмы Р.Баравіковай «Барбара Радзівіл», аповесьці Кастуся Тарасава «Апошняя ноч Міндоўга», раману Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі».

Т.Бондар паведаміла, што яна цяпер не дае інтэрвію журналістам, якія не чыталі яе твораў. Прагучала і крыўда на некаторых неназваных пісьменьнікаў зь «сёньняшніх пакутнікаў», да якіх калісьці было «складана трапіць у кабінэт». Было таксама шмат нараканьняў на чытачоў, якія ня хочуць чытаць нашу цудоўную літаратуру, і на крытыкаў ды журналістаў, якія не прапагандуюць мастацкіх твораў.

**АВ**


АРХІЎ «ЛЯПІСА ТРУБЯЦКОГА»

# Міхалок — кароль бэнзакалёнкі

**«Ляпісы» зьняліся ва Ўкраіне ў рымэйку савецкай кінастужкі «Каралева бэнзакалёнкі». У галоўных ролях перазьнятага кінашлягеру 60-х задзейнічаны расейскія акторы Клара Новікава, Аляксандар Семчаў, а таксама Віле Хаапсала. «Ляпісы» гралі саміх сябе. Музыкі езьдзілі на «бумэры» з нумарам «Бацька», але грошай паводле сцэнару ў іх не было, таму яны расплачваліся за бэнзын выступам на бэнзакалёнцы. Група для фільму выканала дзьве песьні — «Раінька» і «Курвы танчуць баль» (паводле словаў Міхалка, яна выконваецца на палеска-польскім дыялекце). Рэжысэра стужкі Ігара Мінаева настолькі запаліў выступ «Ляпісаў», што той запрасіў іх запісаць саўндтрэк. Дарэчы, Міхалок нядаўна запісаў саўндтрэк да сэрыялу «Пракуратура».**

**SB**

ДЫСКАГРАФІЯ

# DTS jazz



Джаз-група «DTS-band». (р) «DTS-band», 2004.

Рэдкае для Беларусі выданьне — у тым сэнсе, што музыкай айчынных джазмэнаў на іх радзіме мала хто цікавіцца, а таму запісаў гэтага жанру выдаецца мала. У нашым выпадку гаворка ідзе пра перавыданьне альбому групы салістаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестру пад кіраўніцтвам Аляксандра Каліноўскага, які ўпершыню ўбачыў сьвет два гады таму на кампакт-касэце. Сёньня ж з шасьці музыкантаў, што ўдзельнічалі ў запісе альбому у Германіі і Менску, на радзіме засталіся толькі трое. «DTS-band» ужо ў іншым складзе запісаў новы альбом. Што да гэтага, то аматары джазу могуць атрымаць задавальненьне і ад вартага ўвагі выкананьня, і ад самога музычнага матэрыялу, напісанага А.Каліноўскім. Гэта няпростая для ўспрыманьня на фоне «Фабрыкі зорак» музыка, якая, тым ня менш, цалкам адпавядае сучасным тэндэнцыям эўрапейскага аўтарскага джазу. Эх, каб не адно, другое, трэцяе… Ведалі б нашых джазмэнаў і ў Эўропе — і «DTS-band», і «Apple Tea», і «Рэнэсанс».

У найбліжэйшыя сем год разьлічваць на тое, мяркуючы з усяго, не выпадае…

**Маркотны СЛУХАЧ**

## Парк Сымона-музыкі

Старшыня Фонду культуры Ўладзімер Гілеп выступіў з прапановай назваць менскі Цэнтральны дзіцячы парк (былы парк імя Максіма Горкага) дзіцячым паркам Сымона-музыкі. Адпаведны ліст ён накіраваў старшыні Менгарвыканкаму Паўлаву. Гілеп абгрунтоўвае сваё меркаваньне тым, што на тэрыторыі парку перад вайной стаяў дом Якуба Коласа, які згарэў у вайну.

## Шчупак для ТБМ

Падчас сьвяточнага канцэрту з нагоды 15-годзьдзя ТБМ старшыня ПБНФ Вінцук Вячорка падарыў арганізацыі шчупака — «каб не дрэмалі ўсялякія чыноўныя карасі, затлусьцелыя печкуры й каб не пачуваліся вольна прыблудныя піраньі».

## Цыганскі музэй

З прапановай стварыць музэйную экспазыцыю, прысьвечаную цыганскай культуры, зьвярнулася Беларуская сэкцыя міжнароднага таварыства правоў чалавека (Берасьце). Праф. Іван Котляр прапануе стварыць экспазыцыю ў Музэі архітэктуры й побыту ў Строчыцах: там ужо ёсьць аналягічныя выставы, прысьвечаныя беларускім татарам, жыдам, грэкам.

## Скарына ў Каралявцы, Колас і Купала — у Варшаве

У Каралявцы (Калінінградзе) пры канцы кастрычніка зьявіцца помнік Францішку Скарыну. З ініцыятывай помніка выступіла Калінінградзкае зямляцтва беларусаў, якое выдаткавала на гэтыя мэты 30 тыс. даляраў. Аўтар помніка — скульптар Анатоль Арцімовіч. У Каралявцы Скарына жыў пры двары тамтэйшага герцага Альбрэхта.

А на катэдры беларусістыкі Варшаўскага ўнівэрсытэту створаны аргкамітэт па ўстаноўцы ў польскай сталіцы помніка Купалу й Коласу. У яго ўвайшлі праф.Аляксандар Баршчэўскі, перакладчык Коласавай «Новай зямлі» на польскую Чэслаў Сэнюх, дэпутат Сойму Яўген Чыквін, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Міхал Ягела. На арганізацыйнае пасяджэньне прыбыў пасол Беларусі ў Польшчы Павал Латушка. Старшынём аргкамітэту абралі дырэктара Музэю Міцкевіча ў Варшаве праф.Януша Адравонж-Пенёнжка.

## Народзіны Канфуцыя

У Кітаі ўпершыню пасьля 1949 г. (прыход камуністаў да ўлады) быў урачыста адзначаны дзень нараджэньня Канфуцыя. Заснавальніку канфуцыянства споўнілася 2555 гадоў. У цырымоніі, якая прайшла ў горадзе Куфу ва Ўсходнім Кітаі, узялі ўдзел 3000 чалавек.

## Польская бібліятэка ў Парыжы

Пасьля 4-гадовага рамонту ў Парыжы адчынілася Польская бібліятэка, заснаваная ў 1838 г. эмігрантамі, у тым ліку Адамам Міцкевічам і Юліюшам Славацкім. Пасьля другой сусьветнай вайны ёй апекаваліся Ежы Гедройц і Каятан Мараўскі, у ёй працавалі Чэслаў Мілаш і Вітальд Гамбровіч. Рамонт рабіўся на грошы, выдзеленыя фондам імя Зыгмунта Любіч-Залескага й Сэнату Польшчы.

## Слухай сваё!

Нямецкія гуказапісвальныя фірмы патрабуюць, каб Бундэстаг прыняў закон пра абавязковыя квоты на творы айчынных поп-музыкаў на нямецкім радыё. Паводле іхных падлікаў, на нямецкіх радыёстанцыях на матчынай мове гучыць толькі 10% песень.

## Памёр Рычард Авэдон

На 82-м годзе жыцьця ад кровазьліцьця ў мозг у штаце Тэхас памёр фатограф Рычард Авэдон. Фатаграфаваў супэрмадэляў — зрабіў супэрзоркамі Наомі Кэмпбэл і Сындзі Кроўфард. Здымаў аголеную Настасьсю Кінскі, апавітую вялізным удавам. Яму належыць партрэт Сэмюэля Бэкета і фатаздымак ранаў Энздзі Ўорхала, партрэты Брыджыт Бардо, Мэрылін Манро, Чарлі Чапліна.

Авэдон нарадзіўся ў 1923 г. у Нью-Ёрку, у сям'і габрэйскіх эмігрантаў з Расейскай імпэрыі. Пасьля вайны супрацоўнічаў з глянцавымі часопісамі «Harper`s Bazaar», «Vogue». У 1957 г. выйшаў фільм «Сьмешны твар» з Фрэдам Астэрам і Одры Хёпбэрн, якія апавядаў пра парыскага фатографа моды й грунтаваўся на жыцьцяпісе Авэдона.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Вера кардынала

Кардынал Казімер Сьвёнтак: «Я ахвярую гэткае высокае прызнаньне бабулям маёй краіны, якія змаглі захаваць веру ў гады перасьледу, перадаючы яе сваім унукам і праўнукам, тым самым ня даўшы замерці Касьцёлу».

Кардынал Казімер Сьвёнтак, арцыбіскуп Менска-Магілёўскі, атрымаў з рук Папы Рымскага Яна Паўла II прэмію «Fidei testis» («Сьведка веры»), прысуджаную Інстытутам Папы Паўла VI з гораду Брэшыя (Італія). Узнагароджаньне адбылося 27 верасьня падчас сымпозыюму, прысьвечанага 25-годзьдзю інстытуту. Дзякуючы за наданьне яму ўзнагароды, Казімер Сьвёнтак сказаў: «Я ахвярую гэткае высокае прызнаньне бабулям маёй краіны, якія змаглі захаваць веру ў гады перасьледу, перадаючы яе сваім унукам і праўнукам, тым самым ня даўшы замерці Касьцёлу».

Падчас урачыстай цырымоніі Папа адзначыў, што ўзнагарода «Fidei testis» — гэта тытул, які найбольш адпавядае хрысьціяніну, а яшчэ больш — пастыру, які мае кардынальскую годнасьць і які даў мужнае сьведчаньне вернасьці Хрысту і Ягонаму Эвангельлю ў цяжкія гады перасьледу Каталіцкага касьцёлу ва Ўсходняй Эўропе. Згадаў Ян Павал II і пра крыжовы шлях, які мусіў прайсьці кардынал Сьвёнтак у Савецкім Саюзе: «Пан Бог адарыў Вас моцнай і мужнай верай дзеля таго, каб вытрываць у гэтым доўгім і цяжкім выпрабаваньні, пасьля якога Вы вярнуліся ў супольнасьць Касьцёлу як яшчэ больш годны веры сьведка Эвангельля — «Fidei testis». Сам кардынал на пытаньне, як ён здолеў выжыць у ГУЛАГу, зазначыў: «Такое ж пытаньне задаў мне афіцэр КГБ, калі я выходзіў на свабоду. Я адказаў, што жыцьцё сваё даручыў Госпаду і Ён мяне зьбярог».

**БІЯГРАФІЯ**

- Нар. у 1914 у Эстоніі
- 1939 — высьвячаны на сьвятара
- 1939 — арыштаваны
- 1941 — асуджаны на сьмерць, з камэры сьмяротнікаў ратуе прыход немцаў
- 1944 — застаецца з парафіянамі, паўторна арыштаваны
- 1944—1954 — у савецкім канцлягеры
- Ад 1991 — арцыбіскуп Менскі і Магілёўскі

Падчас узнагароджваньня Сьвёнтак уручыў Папу асобнік «Рымскага Імшалу для дыяцэзіяў на Беларусі», які стаў першым у сьвеце зацьверджаным перакладам на беларускую мову трэцяга выданьня Рымскага Імшалу (Missale Romanum), а таксама перадаў кіраўніку Касьцёлу ружанец — падарунак каталіцкай моладзі Беларусі. З удзячнасьцю прымаючы дарунак, Папа пацалаваў крыж на ружанцы.

Кардынал Сьвёнтак сёлета 21 кастрычніка справіць сваё 90-годзьдзе. Нарадзіўся ён у польскай шляхецкай сям'і (што моцна трымалася польскага патрыятызму) у мястэчку Котвіч у Эстоніі. У час першай сусьветнай вайны сям'я эвакуявалася ўглыб Расеі. Бацька загінуў у 1921 г. у баёх за Вільню. У 1922 г. сям'я пераехала ў Баранавічы, дзе будучы сьвятар скончыў мясцовую гімназію. Пасьля заканчэньня Вышэйшай духоўнай сэмінарыі імя Тамаша Аквінскага ў Пінску К.Сьвёнтак быў высьвячаны й стаў у 1939 г. вікарыем у Пружанах.

Пасьля прыходу Саветаў 26 верасьня 1939 г. быў арыштаваны за «шпіянаж» і трапіў у Берасьцейскую турму. З камэры сьмяротнікаў яго вызваліў толькі прыход немцаў у чэрвені 1941 г. — Сьвёнтак вярнуўся да сваіх парафіянаў у Пружаны й застаўся зь імі пасьля сыходу немцаў. Праўда, камуністы ксяндзовай самаахвярнасьці не ацанілі: у сьнежні 1944 г. яго зноў арыштавалі й засудзілі на 10 гадоў лягераў. Адбываў тэрмін у Комі АССР і Сібіры: 2 гады ў Марыінску, 7 гадоў у Варкуце, рэшту — у сібірскай тундры. З таго часу кардынал мае звычку цалаваць хлеб, перад тым як есьці: у савецкіх канцлягерах хлеб меў зусім іншую цану, чым на волі.

Нават у ГУЛАГу Сьвёнтак заставаўся найперш сьвятаром. У сваіх успамінах «Мая доўгая зіма ў Сталінскім ГУЛАГу», друкаваных у 90-х па-ангельску ў газэце «Avvenire», ён згадваў, як адзначалі Нараджэньне Хрыстова ў лягеры. Падчас сьвяткаваньня зайшоў афіцэр з салдатамі й пацікавіўся, што тут адбываецца. Сьвятар адказаў, што яны сьвяткуюць Хрыстова нараджэньне, і запрасіў афіцэра далучыцца. Павісла пагрозьлівая напружаная паўза. Потым афіцэр павярнуўся і моўчкі выйшаў. Наступнае раніцы Сьвёнтака выслалі з Варкуты далей на поўнач, у тундру.

У чэрвені 1954 г. Сьвёнтак вярнуўся ў Беларусь, стала асеў у Пінску. Ня быў рэабілітаваны, таму піша ў анкетах, што мае судзімасьць. Меў магчымасьць пераехаць у Польшчу, але застаўся ў Беларусі. У савецкі час заставаўся адным з маральных аўтарытэтаў антыкамуністычна настроенай інтэлігенцыі. Згадвае Казімера Сьвёнтака ў сваім эсэ «Званы ў прадоньнях азёр» Уладзімер Караткевіч: «Па-сапраўднаму зьдзіўлялі ягоныя веды, памяркоўнасьць і шырокі падыход да зьяў жыцьця. А асабліва зьдзіўляла спалучэньне сапраўднай улюбёнасьці ў старажытнасьць і дасьведчанасьці ў ёй з сучаснай любоўю да тэхнікі. Дужа харошы фатограф, матацыкліст, кінэматаграфіст-аматар (зараз здымае фільм аб прыродзе Палесься), чалавек, які здатны цэлую ноч нерухома праляжаць у лесе, толькі каб запісаць на магнітафон такаваньне глушцоў».

У 1991 г. Сьвёнтак стаў арцыбіскупам, а ў 1994-м Ян Павал II надаў яму годнасьць кардынала — першага ў Беларусі пасьля 1798 г. Аднак у штодзённым жыцьці самога Сьвёнтака амаль нічога не зьмянілася: ягоная рэзыдэнцыя па-ранейшаму ў Пінску, ён не выказваецца на палітычныя й грамадзкія тэмы, займаючыся толькі касьцёлам. Тым ня менш, кардынал не цураецца выказваць грамадзянскую пазыцыю, як на нядаўняй канфэрэнцыі ў Брэшыі, прысьвечанай дзейнасьці Папы Паўла VI. Гаворачы пра сваю сьвятарскую дзейнасьць, Казімер Сьвёнтак заявіў, што ў тыя гады «Захад братаўся з нашымі катамі. Не штодзённая цяжкая праца, не прыніжэньне й гвалт, але менавіта ўсьведамленьне гэтага факту прыносіла нам боль у сталінскіх лягерах».

Сьвёнтак дагэтуль ня мае беларускага грамадзянства, таму ўсе афіцыйныя дакумэнты ў перапісцы зь дзяржавай падпісвае ягоны намесьнік. Аднак беларушчыну ў Касьцёле кардынал прыняў і бласлявіў: беларускамоўныя ксяндзы й беларуская імша пашырыліся ў большасьці касьцёлаў краіны.

**Аркадзь Шанскі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Міжнародная прэмія Паўла VI

Прэмія, згодна са статутам установы, уручаецца раз на пяць год асобе або ўстанове, якая ўнесла надзвычайны ўклад у рэлігійную культуру. Не абавязкова яе атрымальнікам мусіць быць каталік. Першым ляўрэатам у 1984 г. стаў швайцарскі тэоляг Ганс Урс фон Бальтазар за навуковую дзейнасьць. У 1989 г. за дасягненьні ў музычным мастацтве прэмію атрымаў францускі музыка Аліўе Мэсіян. Лютэранскі дзяяч з Францыі Аскар Кульман атрымаў прэмію ў 1993 г. за экумэнічную дзейнасьць. Апошняе па часе ўзнагароджаньне адбылося ў 1997 г.: канадзец Жан Ванье, заснавальнік арганізацый «Каўчэг» і «Вера і сьвятло», стаў ляўрэатам за дзейнасьць у абарону разумова непаўнавартасных асоб.

## Уладзімер Караткевіч пра Казімера Сьвёнтка:

«Па-сапраўднаму зьдзіўлялі ягоныя веды, памяркоўнасьць і шырокі падыход да зьяў жыцьця. Дужа харошы фатограф, матацыкліст, кінэматаграфіст-аматар (зараз здымае фільм аб прыродзе Палесься), чалавек, які здатны цэлую ноч нерухома праляжаць у лесе, толькі каб запісаць на магнітафон такаваньне глушцоў».

# Алесь Наркевіч: А я сабе сьпяваю!

**Сёлета, ужо ня пяршы год, 4 верасьня пад Воршай праходзіў фэстываль бардаўскай песьні. Гэта своеасаблівая даніна павагі да вояроў, якія загінулі тут у 1514 г., Радзіму сваю баронячы. Як звычайна, удзел бралі ўсе ахвотныя з розных куткоў Беларусі. А вось пераможцам з фэсту паехаў дадому бард Алесь Наркевіч зь Вялейкі. Імя яго яшчэ зусім невядомае ў бардаўскім асяродку, але гэта толькі пытаньне часу. Калісь і Зьміцер Бартосік быў малавядомым, пакуль не перамог на гэтым фэсьце. З нагоды перамогі Алесь даў першае ў жыцьці інтэрвію.**


АЛЯКСЕЙ СЮДАК

**— Алесь, раскажы пра сябе і пра фэст.**

— Пра фэстываль даведаўся з «НН». Мой сябар Міхась на Аршаншчыну ўжо ня першы раз езьдзіў. І мне ўсё неяк карцела, а сёлета нарэшце ўдалося. І падумалася: чаму ня ўзяць інструмэнт? Тым больш што Зьміцер Абразцоў (бард зь Вялейкі. — **Аўт.**) з гітарай ехаць зьбіраўся. Паехалі мы. Усё за свой кошт. Упершыню выехаў так па-за межы нашага раёну славутага. Тусоўка на фэстывалі была нармалёвая. Выглядала гэта так, нібы сабраліся знаёмыя людзі. Калі хто хацеў прасьпяваць — на здароўе, запісвайся і сьпявай. Што мы са Зьмітром урэшце і зрабілі. Аказалася, прысутным спадабалася. Пасьля зноў мяне запрасілі прасьпяваць. Тады і прысудзілі мне прыз нечакана для мяне.

**— Пасьля перамогі табе былі зроблены нейкія прапановы — касэту запісаць, узяць удзел у нейкім канцэрце?**

— Падыходзілі нават аўтограф пыталіся! Падыходзілі дзяўчаты зь Менску, з унівэрсытэту культуры, запісвалі мой тэлефон. Казалі, што на наступны год у Крэве ў іх будзе нешта адбывацца. Пыталіся, ці змог бы я пад'ехаць. Каб раніцаю прачнуцца знакамітым — зразумела, такога не было. Бо ніякага супэр-шоў там не было. Сабраліся проста аднадумцы. Было цікава проста выступіць. Ня часта мы гэта робім.

**— Са Зьмітром Абразцовым ты ў вёсках Вялейскага раёну ладзіш бясплатныя канцэрты. Як вяскоўцы ўспрымаюць гэтыя выступы?**

— Як ні дзіўна, людзі на канцэрты прыходзяць. Бывае, зьбіраецца і 100 чалавек, бывае, і 20. Мы пачыналі езьдзіць з Абразцовым удвух. Але сёньня з намі езьдзіць яшчэ і Алесь Алесік, які на гітары шпарыць — супэр.

Аднойчы мы прыехалі ў вёску Лыцавічы, а там ледзь не чарга зь дзетак выстраілася па аўтографы. Успрымаюць нашы песьні людзі па-рознаму. Некаторыя пасьля канцэрту падыходзяць і дзякуюць. У Вялейцы мы адзін канцэрт ладзілі. Дык там увогуле сталы мужык падышоў і са сьлязьмі ў вачах сказаў: «Дзякуй, што вы ёсьць, што ня ўсё страчана». Успрымаецца ўсё добра, я сказаў бы. Таму і езьдзім, у прынцыпе. Запрашаюць звычайна ў вясковыя клюбы, дзе ёсьць больш-менш нейкае жыцьцё.

Аднаго разу летам мы прыехалі ў адну зь вёсак. Можа, што ня так зрабілі, бо прыйшло толькі 5—10 чалавек. Але і тое пасьля канцэрту падышла да нас маладая жанчына і сказала: «Вялікі дзякуй. Я ведала, на што ішла. І атрымала тое, што хацела».

**— А не здаралася такога, што падчас канцэрту ў залю прыходзіла вясковая ўлада і выступ прыходзілася спыняць?**

— Не, пакуль не было. У вёсцы Ільля адбыўся крыху іншы інцыдэнт. Мы ў тэхнікуме выступалі. Народу назьбіралася сьвет. Усё нармалёва там усрымалася. У канцы ўсе разышліся, а да нас падышла жанчына, якая займаецца ідэалягічнай працай: «Спасибо, что вы приехали. Но конечно, если бы я знала, что вы такое петь будете, я бы не разрешила». — «А што такое? Якія пытаньні?» — пачалі мы зь ёй размаўляць. «Ну вот эта последняя песня, что, ваш гимн?» — «Якая песьня?» — «Ну вот эта, про «бел-чырвона-белую?» — «Не, проста такія песьні сьпяваем». — «Если бы я знала… Вообще, меня завтра с работы уволят».

Пачаў ёй тут Зьміцер Абразцоў тлумачыць, што нічога страшнага ў гэтым няма — не яна першая была. Мы ж ужо ў іншых месцах выступалі.

«Это всё не то. У нас здесь учебное заведение». Ну, такая расейская цёця. Тады Абразцоў пытаецца: «А Вы самі адкуль прыехалі?» — «Я вообще-то не белоруска. У меня даже гражданства нет. Я приехала из Казахстана, но сама я украинка».

Пра што тут можна тады казаць? І яна займаецца ідэалягічнай працай, і такія выхоўваюць нашых беларускіх дзетак. Вось такое было. А так усё добра. Звычайна кажуць: дзякуй, заяжджайце яшчэ. Грошай мы не бяром — катаемся бясплатна. Адно што калі ёсьць якая падтрымка ў сэнсе саляркі ў машыну заліць.

**— Алесь, а калі ты ўпершыню ўзяў гітару ў рукі, пачаў займацца бардаўскай песьняй?**

— Гітару я даўно ўзяў, але і дагэтуль не навучыўся на ёй іграць так, як бы я гэтага хацеў. Гітару даў мне неяк матчын стрыечны брат. Было мне тады гадоў 10. Зь беларускімі песьнямі пайшло, як з войска вярнуўся ў 1990 г. Прыйшоў, а ў нас жа тут «перабудова», аказваецца. Я ж ня ведаў, што тут робіцца: з 1987 да 1990 — служба. Яшчэ ў 1987 г., адыходзячы на службу, мы зь сябрамі дамовіліся пісаць лісты толькі на беларускай мове. Аднаго сябра савецкая армія закінула ў Чыту, я быў на Сахаліне, нехта ў Прыбалтыцы, Германіі. А вакол «саветызм». Зразумела, што Беларусяй там і ня пахла.

Ну вось, патроху песьні пачалі складвацца. 1991 год, выбары нейкія. Людзі пачалі па плошчах на мітынгі езьдзіць. Сам неаднаразова езьдзіў, але не «привлекался». Пазьняк тады выступаў. Усё да толку было. Шэсьці былі цікавыя, шумныя, сур'ёзныя. Пасьля гэта ўсё спала. Засталіся толькі песьні, скажам так.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

**АНКЕТА**
**Дзень нараджэньня**: 23 красавіка 1969 г.
**Месца нараджэньня**: г. Вялейка.
**Веравызнаньне**: праваслаўны.
**Сямейнае становішча**: халасьцяк.
**Адукацыя**: пакуль 10 клясаў СШ.
**Улюбёны айчынны пісьменьнік**: Уладзімер Арлоў.
**Улюбёны айчынны сьпявак**: Данчык.
**Улюбёны айчынны гурт**: «NRM», «Крама».
**Жыцьцёвае крэда**: «Быў. Ёсьць. Буду» (У.Караткевіч).

## Будзе. Будзе. Веру́ю

Будзе. Будзе. Верую.
Бел-чырвона-белыя
Над зямлёй зьняважанай
Ўздымуцца сьцягі.
І народ, зьняможаны
Зману брыдкай ношаю,
Перастане мардаваць
Лёс — цяжкі, благі.
І убачыць здолее,
Што у ім — гісторыя.
Тое, што нашчадкам жаць,
Сеялі бацькі.
Скіне путы даўнія
Гнёту і бяспраўя,
Зразумее волю
Вольнае ракі,
Годнасьць чалавечую,
Што была зьнявечана,
Што хлеб рабскай долі
Брудны і гаркі...
І тады, я веру, —
Бел-чырвона-белыя
Над маёй Радзімаю
Ўздымуцца сьцягі!

# Вылазьце з кухні і болей туды не вяртайцеся

Працяг са старонкі 2.

Гэтаму цяжка навучыцца ў вузкім сяброўскім коле, гэтаму ня вучаць ані ў школе, ані ў ВНУ.

Выснова банальная: каб сьпяваць, трэба сьпяваць. «Бардаўская восень» у Бельску ня можа быць адзіным месцам у сьвеце, дзе адбываюцца агледзіны беларускай аўтарскай песьні. Мне падаецца, што ў Бельску павінны спаборнічаць яшчэ пачаткоўцы, але ўжо прафэсіяналы, і іх магло б быць ня дзесяць, а меней. Адборачны канцэрт у Менску, у сваю чаргу, павінен быць адначасова галоўным фэстывалем аўтарскай песьні ў Беларусі.

Дзеля гэтага, на першы крок, патрэбна няшмат: даваць болей інфармацыі, што такі фэстываль ёсьць. Сёлета, на жаль, я не сустрэў ніводнае абвесткі пра тое, што такі канцэрт адбудзецца. Думаю, што мала хто іншы пра яго чуў. Тады каму сьпявалі свае песьні барды? Сябрам, што прыйшлі падтрымаць, і сябрам журы? А там, дарэчы, было што паслухаць.

Беларусі сёньня па-ранейшаму патрэбная сьпяваная паэзія, ці, як трапна выказаўся музычны крытык Ляшчынскі, «песьні Тэксту». Безьліч тэмаў, формаў, стыляў папросту адсутнічаюць у нашым музычным даробку, і Вольскі за ўсіх не напіша. Рок-канцэрты, з прычыны сваёй дарагавізны, мала дзе ў Беларусі могуць адбыцца, а зь іншага боку, барды старэйшай генэрацыі аб'езьдзілі са сваімі акустычнымі гітарамі ці ня ўсю краіну. У нас няма кабарэтаў, утульных артыстычных кавярняў, але паўсюдна ёсьць нармальныя людзі, якім такая музыка патрэбна. Ва ўсіх гэтых людзей ёсьць магніфафоны, каб слухаць касэты зь «песьнямі Тэксту», і знойдзецца крыху грошай на недарагі білет. Але пры адной умове: гэта павінна быць цікава і прафэсійна. А каб гэтак было, трэба вылазіць з кухні і болей ніколі туды не вяртацца.

Адзін з прызоў «Бардаўскай восені» — гэта час на запіс альбому пераможцы ў студыі Польскага радыё. Пераможцу папросту часам бракуе матэрыялу на такі альбом, часам — грошай, каб даехаць да Беластоку і жыць там падчас сэсіі, часам — часу ці ахвоты. Часам запісаны ўжо матэрыял аказваецца занадта слабым з пункту гледжаньня прафэсійнага. Але пра гэта таксама трэба гаварыць, гэта таксама тэма для публічнага абмеркаваньня. Тым болей вартыя рэцэнзіяў удалыя запісы пачаткоўцаў. І натуральна, што яны мусілі б быць выдадзеныя, таксама і ў Беларусі. За 11 гадоў існаваньня фэстывалю мы маем дзесяць пераможцаў і два дзясяткі тых, хто займаў другое ці трэцяе месца. Вельмі хацелася б іх паслухаць, хаця б на зборным альбоме. Тым болей што для гэтага ёсьць добрая нагода: сёлетні, 11-ы па ліку фэстываль, будзе дзясятым конкурсным. Дзесяць гадоў добрых песьняў — гэта нямала.


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Яўген Валошын прэтэндэнт на перамогу ў «Бардаўскай восені».**

# Траянскі конь



**6 кастрычніка Эўракамісія мусіла вызначыцца, ці будзе вынесенае на разгляд саміту ЭЗ пытаньне аб пачатку перамоваў з Анкарой аб уступленьні Турцыі ў ЭЗ. 17 сьнежня на саміце ў Брусэлі Эўразьвяз мае прыняць канчатковае рашэньне, ці будзе Турэччына запрошаная ў яго склад. Пакуль шанцы пяцьдзясят на пяцьдзясят. Супраць выступае Аўстрыя, між тым рашэньне павінна прымацца кансэнсусам. Некаторыя прыхільнікі эўраінтэграцыі асьцерагаюцца, што ўступленьне Турэччыны ў Эўразьвяз азначала б разбурэньне Эўразьвязу як палітычнага адзінства. Аднак, магчыма, гэткае разбурэньне пайшло б на карысьць самой Эўропе.**

Падмуркам эўраінтэграцыі было імкненьне да вольнага гандлю, дэмакратызацыі і пазьбяганьня новых войнаў. Ва ўсіх трох аспэктах дасягненьні застаюцца спрэчнымі.

Вынік, якім найбольш ганарацца эўраэліты, — немагчымасьць ваенных канфліктаў. Сапраўды, Францыя і Нямеччына перажываюць пэрыяд паразуменьня і гармоніі. Але ж калі разглядаць праблему бясьпекі шырэй, то галоўным гарантам міру ў Эўропе было трансатлянтычнае партнэрства з ЗША, бо менавіта перамога Амэрыкі ў халоднай вайне прывяла да падзеньня Бэрлінскага муру. Улічваючы супольныя інтарэсы Эўропы і Амэрыкі ў барацьбе супраць тэрарызму, трансатлянтычнае партнэрства застаецца жыцьцёва важным для эўрапейскае бясьпекі. Аднак менавіта яно ставіцца эўраінтэгратарамі пад сумнеў, бо ў іхнім разуменьні мэта эўраінтэграцыі — стварэньне эўрапейскае звышдзяржавы дзеля абмежаваньня амэрыканскае гегемоніі. Ужо цяпер сьпіс супярэчнасьцяў паміж ЭЗ і Амэрыкай уключае Ірак, Палестыну, балістычную ракетную абарону, кантроль за ўзбраеньнямі, Міжнародны крымінальны суд, генэтычна мадыфікаваныя прадукты харчаваньня, Кіёцкі пратакол, сельскагаспадарчыя субсыдыі, Іран, Кубу і г.д. У пляны эўрастратэгаў уваходзіць таксама стварэньне войска Эўразьвязу, непадпарадкаванага камандаваньню NATO, а яшчэ — адмена эмбарга на гандаль зброяй з Кітаем. Як у свой час заўважыла Маргарэт Тэтчэр, стварэньне эўрапейскае звышдзяржавы непазьбежна прывядзе да супрацьстаяньня з Амэрыкай. У гэтым сьвятле далейшая эўраінтэграцыя пагражае стацца фактарам нестабільнасьці ў Эўропе.

Другі падмурак ЭЗ — супольны рынак — прывёў да эўра. Затое зьявіліся іншыя перашкоды на шляху вольнага руху працоўнае сілы, тавараў і паслуг. Сюды ў першую чаргу адносіцца Агульная сельскагаспадарчая палітыка (САР) — антырынкавая сыстэма субсыдыяваньня эўрапейскіх фэрмэраў, якая штогод каштуе падаткаплатнікам дзясяткі мільярдаў эўра і прыводзіць да падаражаньня прадуктаў на 40%. Яшчэ адзін вынік эўраінтэграцыі — неўтаймоўная вытворчасьць інструкцый і падзаконных актаў, колькасьць якіх даходзіць да 2500 у год. Заканадаўчая дзейнасьць Эўразьвязу выкарыстоўваецца сярод іншага дзеля абмежаваньня канкурэнцыі. Так, выкананьне Польшчай экалягічных нормаў Эўразьвязу, якое абыдзецца ёй прыблізна ў 40 мільярдаў эўра, прывядзе да падаражаньня польскіх тавараў і пойдзе на карысьць заходнеэўрапейскім вытворцам. Такім чынам, менавіта далейшая эўраінтэграцыя прыводзіць да абмежаваньня вольнага гандлю і мае вынікам эканамічную стагнацыю. Ня дзіва, што самыя багатыя краіны Эўропы — Нарвэгія і Швайцарыя — у Эўразьвяз не ўваходзяць.

Нарэшце, дэмакратызацыя так і ня сталася прынцыпам эўрапалітыкі. Трапна заўважана, што сам Эўразьвяз не прайшоў бы тэсту на дэмакратычнасьць дзеля ўступленьня ў свой склад. Прычынай таму — непразрыстыя і непадкантрольныя структуры Брусэлю і Страсбургу. Напрыклад, урад Эўразьвязу — Эўракамісія — мае заканадаўчыя, выканаўчыя і судовыя функцыі, гэтым самым парушаючы прынцып падзелу ўлад, а Эўрапарлямэнт паводле сваіх паўнамоцтваў нагадвае хутчэй дыскусійны клюб. Непадкантрольнасьць брусэльскіх структур выбарнікам прыводзіць да высокага ўзроўню карупцыі. Паводле зьвестак аўдытарскае фірмы «Ernst&Young», каля 5% бюджэту Эўразьвязу, або 6 мільярдаў эўра ў год, зьнікаюць бяз знаку.

Аналіз функцыянаваньня Эўразьвязу дэманструе, што глыбейшая эўраінтэграцыя супярэчыць інтарэсам эўрапейцаў. Тым ня менш, эўраэліты ўпарта працягваюць высілкі, накіраваныя на стварэньне эўрапейскае звышдзяржавы, прыносячы ў ахвяру эўраінтэграцыі бясьпеку, дабрабыт і дэмакратыю. Таму менавіта Турэччына, не раўнуючы траянскі конь, можа паставіць крыж на плянах стварэньня эўрапейскае звышдзяржавы. Пры гэтым шанцы на запрашэньне Турэччыны ў Эўразьвяз залежаць ад энэргічнае падтрымкі самага вялікага прыхільніка яе сяброўства ў Зьвязе — Амэрыкі. У мінулым Злучаныя Штаты неаднаразова ратавалі Эўропу ад самое сябе. Добрая традыцыя, якую варта працягваць. На карысьць самых эўрапейцаў.

**Сяржук Вінаградаў, siarzhuk.vinahradau@tut.by**

РОДНЫЯ ДЗЕЦІ

# Не трымай рук пад коўдрай

Сяргей Будкін

У дзяцінстве я з маці вельмі любіў хадзіць у кіно. Старажылы сталічнага мікрараёну Паўднёвы Захад памятаюць камэрцыйную відэазалю «Галяктыка», што паўстала на самым пачатку 90-х і праіснавала некалькі год. Такія відэасалёны тады адчыняліся ва ўсіх куточках Менску. Відэамагнітафон тады яшчэ быў рэдкай зьявай, таму замежнае кіно выклікала вялікую цікавасьць. Каб трапіць на баявік з Чакам Норысам, трэ было набыць квіток за некалькі гадзін да пачатку сэансу, каб не стаяць у вялікай чарзе. І вось мы ў залі!

Аднак асалоду ад прагляду я атрымоўваў не заўсёды, з адной простай прычыны: у галоўнага героя баевіка, як правіла, была пекная знаёмая, зь якой ён скакаў з даху на дах, хаваўся ад страляніны і… вядома ж, мілаваўся ў ложку. Гэтых момантаў, што праўда, я ня бачыў, бо маці прыкрывала сваёй далонькаю мне вочы. Памятаю, трапілі мы на савецкі кінагіт «Інтэрдзяўчынка», дык мне прыйшлося прасядзець з закрытымі вачыма добрую палову стужкі.

Нашы бацькі не былі падрыхтаваныя да такіх вынікаў перабудовы, таму першае, што ім прыйшло да галавы зрабіць, каб абараніць сваё дзіця ад аголенасьці і разбэшчанасьці на экране, гэта проста закрыць яму вочы. Тэма сэксу холадна ігнаравалася ў нашай сям'і (і ў мільёнах іншых савецкіх сем'яў таксама), таму ў «дваровых» размовах нам зь сябрамі прыйшлося самім шукаць адказы на шматлікія пытаньні. Памятаю, калі нам было па 13—14 год, вырашылі з адным зь сяброў падзяліцца самымі патаемнымі сакрэтамі. «Я цалаваўся зь дзяўчынай», — выціснуў я зь сябе (выдаючы жаданае за сапраўднае). «А я мастурбую», — сказаў сябрук з такой інтанацыяй, нібыта ён сьмяротна хворы. Усьведамленьне таго, што ананізм — не хвароба і валасы паміж пальцамі ад такога занятку не растуць, прыйшло неяк само сабой крыху пазьней…

Тып паводзінаў, што абралі нашы бацькі ў дачыненьні да палавога выхаваньня, сэксолягі называюць «рэпрэсіўны», калі ўсё зводзіцца да заўваг «як табе ня сорамна» і «так нельга». Савецкія мэдычныя энцыкляпэдыі раілі: «Каб адвучыць дзіця ад шкоднай звычкі аніравання, трэба намагацца, каб яно не трымала рук у кішэнях ці пад коўдрай». Такога кшталту даведнікам нашы бацькі давалі веры… У выніку — дзіця самастойна дасьледуе забароненую пуцявіну ды пашырае свае гарызонты пазнаньня. Куды яно зойдзе ў гэтых пошуках — справа іншая.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Абраць правільны шлях выхаваньня няпроста. Маладзейшыя бацькі майго сябрука дзейнічалі не рэпрэсіўна, яны проста пазьбягалі пра гэта размаўляць, каб не прыцягваць увагі. Маўляў, пасталее — зразумее. Усё адно — пазнавалі пытаньне мы зь ім разам, з дапамогай нямецкіх эратычных стужак. Ягоны бацька ўпершыню завёў размову наконт гэтага, калі хлопцу было ўжо 20 год.

Акрамя рэпрэсіўнай і пазьбягальнай тактыкі, сэксалягічная літаратура вылучае яшчэ два тыпы паводзінаў у дачыненьні да палавога выхаваньня — назойлівы і экспрэсіўны. Першы характарызуецца лібэральнасьцю, аднак канцэнтраваньне на гэтай тэматыцы можа выклікаць у дзіцяці адмоўнае стаўленьне (як, напрыклад, сумесны прагляд эратычнай стужкі). Пры другім тыпе паводзінаў увага на сэксе не завастраецца, але надзённыя пытаньні заўсёды абмяркоўваюцца ў коле сям'і. Усё залежыць ад бацькоў: як яны здолеюць падаць інфармацыю, такое да яе і будзе стаўленьне.

Цяпер дзеці растуць у іншых умовах. Камэрцыйныя відэазалі, дзе паказвалі «Мора каханьня» і «Дзікую архідэю», ужо даўно пазачыняліся, затое расьце колькасьць кампутарных клюбаў, дзе дзеці могуць бавіць час ня толькі за гульнямі, але і за праглядам інтэрнэт-сайтаў, зьмесьціва якіх можа выклікаць шок і ў дарослага чалавека. Ці кантраляваць сёньняшніх дзяцей і закрываць ім вочы, ці, можа, заплюшчваць вочы самім і ня думаць пра гэта? Чытаць на ноч разам сэксалягічную літаратуру ды ўсталяваць дазволеныя межы для такіх паводзінаў, унушыўшы, што нічога заганнага ў сэксуальнай актыўнасьці няма? Мне падабаецца апошні варыянт.

Можа, тады маё будучае дзіця не палезе на вычварэнскія інтэрнэт-сайты.

**sb1@tut.by**

У пару Інтэрнэту парнаграфія стала даступная дзецям. Гэта ставіць бацькоў перад новымі выклікамі.

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

21 верасьня гарадзенскае тэлебачаньне не паказала выступу кандыдата ад ПБНФ **Мікалая Ворана**. Адміністрацыя Маскоўскага раёну Менску 27 верасьня адмовіла пратэстанцкім суполкам **«Царква Ісуса Хрыста»**, **«Царква «Новае жыцьцё»**, **«Новы Запавет»** і **«Надзея выратаваньня»** ў арэндзе памяшканьняў для богаслужэньня. 28 верасьня ўдзельнікі «Шэсьця бяздомных студэнтаў» **Сяржук Семянюк** і **Юры Сідун** былі аштрафаваныя на 7 базавых велічынь за супраціў пры затрыманьні. С.Семенюку пагражаюць выключэньнем з Аграрна-тэхнічнага ўнівэрсытэту. У Воранаве 28 верасьня міліцыянты склалі пратакол на пэнсіянэра **Юзафа Кірвеля** за распаўсюджваньне газэты «Тут і цяпер». Кандыдатак у дэпутаты **Ларысу Насановіч** і **Ніну Ярмалінскую** 28 верасьня ў Салігорску затрымалі міліцыянты, зьвінаваціўшы ў распаўсюдзе ўлётак: у міліцыі іх абшукалі, разьдзеўшы амаль дагала. У Магілёве 28 верасьня падчас расклейкі налепак кааліцыі «5+» быў затрыманы сябар ПБНФ **Зьміцер Салаўёў**. У кватэру былога лідэра барысаўскай філіі «Зубра» **Аляксандра Моніча** спрабавалі забрацца невядомыя, 29 верасьня дырэктар Барысаўскага хлебазаводу прапанаваў яму звольніцца з уласнага жаданьня. 29 верасьня сьледчыя вярнуліся да крымінальнай справы непаўналетніх «зуброўцаў» **Кацярыны Клімко** й **Максіма Громава**, якую завялі летась за надпіс «Свабоду Марынічу!», але спынілі праз адсутнасьць складу злачынства. Кандыдат у дэпутаты **Яўген Валкавец** («Малады фронт») з Жодзіна 29 верасьня пакараны штрафам у 1 б.в. за расклейку ўлётак супраць трэцяга тэрміну. Кандыдату ад ПБНФ **Сяргею Салашу** (Барысаў) 29 верасьня ў пракуратуры паведамілі, што на яго маюць завесьці крымінальную справу: намесьніца старшыні гарвыканкаму Шутко вінаваціць яго ў пагрозе фізычнай расправы. 29 верасьня ў Воршы міліцыянты правяліператрус у штаб-кватэры кандыдата ад АГП **Генадзя Ананьева** ў адсутнасьць гаспадара і бяз ордэру, 3 кастрычніка яго затрымалі за распаўсюджваньне сваіх перадвыбарных улётак. Каардынатара «Зубра» **Мікіту Сасіма** 29 верасьня затрымалі ў цэнтры Менску і завезьлі ў прыёмнік-разьмеркавальнік: 24 верасьня ён быў завочна асуджаны на 15 сутак арышту. Прыватную друкарню **«Топ Тайп»**, якая друкавала перадвыбарныя ўлёткі дэмакратычным кандыдатам, 29 верасьня апячаталі. Кандыдата ў дэпутаты **Алеся Карніенку** 29 верасьня затрымалі на берасьцейскай мытні й канфіскавалі 32 асобнікі перадвыбарных улётак, у Гомелі дзяржаўныя друкарні адмовіліся друкаваць ягоныя ўлёткі. На старшыню берасьцейскай філіі ПЦ «Вясна» **Ўладзімера Вялічкіна** 29 верасьня склалі пратакол за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Рэдактарку недзяржаўнай газэты «Биржа информации» (Горадня) **Алену Раўбецкую** 30 верасьня суд аштрафаваў на 70 б.в. — «за зьнявагу гонару й годнасьці прэзыдэнта». Адвакатка **Вера Страмкоўская** 1 кастрычніка падала скаргу ў Менскую абласную пракуратуру, каб спыніць крымінальную справу **Міхаіла Марыніча**. 1 кастрычніка суд Ленінскага раёну пастанавіў спагнаць з газэты **«Народная воля»** 776 тыс. руб. на карысьць прадпрымальніка Сяргея Атрошчанкі для кампэнсацыі ягоных судовых выдаткаў. Актывіст «Зубра» **Аляксей Шыдлоўскі** 1 кастрычніка затрыманы ў Менску падчас распаўсюду ўлётак і аштрафаваны на 30 б.в. Мінінфармацыі 1 кастрычніка прыпыніла на 3 месяцы выхад газэт **«Народный предприниматель»** (Наваполацак) і **«Рэгиональные ведомости»** (Горкі). 1 кастрычніка ўначы ў Менску без прад'яўленьня ордэру міліцыянты наладзіліператрус у штаб-кватэры кандыдатаў у дэпутаты **Валянціны Палевіковай** і **Аляксандра Дабравольскага**, канфіскавалі перадвыбарныя ўлёткі й газэту «Неделя». У Віцебску 1 кастрычніка **Барыса Хамайду** аштрафавалі на 20 б.в. «за несанкцыянаванае пікетаваньне», а **Валер'я Шчукіна** затрымалі й абшукалі на чыгуначным вакзале. 2 кастрычніка ў менскім офісе Свабодных прафсаюзаў міліцыя перапісала прысутных на каардынацыйным сходзе арганізацыі салідарнасьці **«Айчына»**. Машыну **Хрыстафора Жаляпава**, кіраўніка віцебскай філіі фонду імя Лява Сапегі, 3 кастрычніка пад Бешанковічамі спынілі міліцыянты й канфіскавалі ўлёткі супраць трэцяга тэрміну. У Віцебску 3 кастрычніка міліцыянты перапынілі сэмінар па праблемах ЖКГ, ладжаны дэпутаткай гарсавету **Вольгай Карач**, былі затрыманы **Сьцяпан Цішуцін** і **Зьміцер Сенчукоў**. У Гомелі 2 кастрычніка ўзброеныя аўтаматамі міліцыянты наладзілі надгляд прыватнай машыны кандыдата ў дэпутаты ад АГП **Юр'я Варонежцава**. Кандыдат ад ПБНФ **Віктар Раманішка** са Сьветлагорску 3 кастрычніка зьвярнуўся з скаргай у ЦВК: гарадзкія ўлады перашкаджаюць яму весьці перадвыбарную агітацыю. Рэчыцкая друкарня «Тытул» 4 кастрычніка сапсавала ўвесь наклад ягоных перадвыбарчых улётак. 4 кастрычніка прадстаўнікі падатковай інспэкцыі наведалі офіс **АГП** у Менску: іх цікавіў выдавецкі дом **«Время»**, юрыдычны адрас якога зарэгістраваны на сядзібе партыі. Актывістку «Зубра» **Маргарыту Анцілеўскую** 4 кастрычніка міліцыянты затрымалі ў Менску падчас раздачы газэты «Супраціў» і, зь яе словаў, зьбілі дубінкамі. Кандыдату ад ПБНФ **Валеру Пуціцкаму** ў Рэчыцы 4 кастрычніка адмовіліся друкаваць перадвыбарчыя ўлёткі.

**АШ**

## Новы ліст галоўнаму рэдактару «Советской Белоруссии»

Шаноўны Павал Ізотавіч,

Ваш чарговы допіс «Вяленький цветочек» прысьвечаны старту выбарчай кампаніі і прасякнуты клопатам пра прафэсіяналізм будучага парлямэнту. І адразу ж Вы зьвяртаеце ўвагу на тых, каму ў іх няма чаго рабіць. «Начныя вартаўнікі і прафэсійныя беспрацоўныя, замацярэлыя пэнсіянэры і хатнія гаспадыні. Хто яны, куды іх гоніць?»

А чаму, Павал Ізотавіч, яны ня могуць прэтэндаваць? Дзіўна, бо выбарчае заканадаўства аніяк не дыскрымінуе ні вартаўнікоў, ні пэнсіянэраў, ні беспрацоўных, ні хатніх гаспадынь. Наколькі разумею, названыя прэтэндэнты сабралі неабходную колькасьць галасоў для рэгістрацыі. А паколькі яны зьяўляюцца прадстаўнікамі тых грамадзян, што вылучылілі іх, то ставіцца да іх непаважліва неяк не выпадае.

Да таго ж, Вы чамусьці думаеце, што яны «рвуцца ў Парлямэнт», каб там «папісаць для нас законы». Скажу шчыра: асьцярогі Вашы марныя, бо ня пішуць у нас парлямэнтары законаў. Вось, напрыклад, былы старшыня савету рэспублікі А.Вайтовіч узгадвае: «Парлямэнт не рыхтуе (або амаль не рыхтуе) праектаў законаў. За час маёй працы ў парлямэнце не магу прыгадаць ніводнага выпадку прыняцьця закону, унесенага парлямэнтам». А пішуцца ў нас законы Цэнтрам законапраектнай дзейнасьці пры Прэзыдэнту РБ.

Не магу, аднак, не парадавацца з Вамі за тых прэтэндэнтаў у кандыдаты, якіх урэшце зарэгістравалі. Добра, безумоўна, і тое, што выбарчая камісія разабралася з выпадкам «бессаромнай фантасмагорыі». Але кепска тое, што «лянівыя бюракраты наблытаюць у паперах, не зьвядуць канцы з канцамі», камісія адразу не разьбярэцца, а прэтэндэнту даводзіцца падаваць скаргу. І выходзіць так, што ў яго, як Вы напісалі, «зьяўляецца добры шанец яшчэ да старту сысьці з дыстанцыі».

Ня ведаю, наколькі шанец добры, але апісаная Вамі сытуацыя прымусіла мяне глыбока задумацца. Падалося мне дзіўным, як гэта можна сысьці з дыстанцыі, яшчэ не стартаваўшы?

Хаця ўсё можа быць... Не знайшоўшы рацыянальнага тлумачэньня, зьвярнуўся да сваёй падсьвядомасьці. І яна «выдала» мне такі пасаж з камэнтару аднаго вядомага за савецкім часам футбольнага аглядальніка: «Падчас мінулай гульні гэты футбаліст іграў ролю першай скрыпкі. Але сёньня ён, відаць, забыў дома сваю дырыжорскую палачку».

Дзіўная ўсё ж гэта рэч — падсьвядомасьць!

З пажаданьнямі Вам посьпехаў,

**Алесь Анціпенка, грамадзянін РБ**

## Што робіцца ў Швэцыі

На запрашэньне арганізацыі «Vitryssland» маладая беларуская паэтка Яўгенія Германчук, пераможца кубку моладзевай паэзіі ў Пінску ў 2004 г., гасьцявала тыдзень у Стакгольме. Была наладжана яе творчая сустрэча ў сядзібе Швэдзкага саюзу пісьменьнікаў. Швэды прызнаваліся, што нічога ня ведаюць пра беларускую літаратуру, ды задавалі шмат пытаньняў.

Расьце зацікаўленасьць да Беларусі. За апошні месяц найбуйнейшая газэта «Dagens Nyhetre» апублікавала пяць вялікіх артыкулаў, прысьвечаных розным аспэктам жыцьця сучаснай Беларусі. Іх аўтар — карэспандэнт у Маскве Эрык Ольсан.

25 верасьня ў Стакгольме адбылася прэм'ера фільму «Акупацыя».

Атрымаў ліст падзякі ад старшыні парлямэнту швэдзкіх саамі за першую публікацыю пра іх у Беларусі (у «НН»). Ён дасылаў мне дзьве кніжкі пра іх.

**Андрэй Катлярчук, Стакгольм**

## Пра вяртаньне маёмасьці, страчанай у вайну

Між Польшчаю і Нямеччынай горача абмяркоўваецца пытаньне рэпарацыяў і вяртаньня нерухомасьці, адабранай пасьля другой сусьветнай вайны. Здавалася б, гэтыя дзьве краіны разам будуюць Эўразьвяз, паміж імі падпісана шмат дагавораў, шмат прынесена прабачэньняў (нямецкім бокам), а от жа гэтыя праблемы застаюцца актуальнымі.

У апошнія гады дзясяткі тысяч прыватных асоб у Нямеччыне, у бальшыні — былых выгнанцаў ці іх нашчадкаў, склалі ў судах мільёны скаргаў аб кампэнсацыі ці вяртаньні маёмасьці на тэрыторыях, аддадзеных Польшчы пасьля вайны. Ужо былі выпадкі задавальненьня пазоваў, маёмасьць некаторых грамадзян была ім вернута (нават польскімі судамі). Палякі Шлёнску, Памераніі абураюцца. Але ж і баяцца далейшага лёсу займанай імі маёмасьці. Немцы яшчэ й скупляюць зямлю (а гэта ў асноўным зямля былых ПГР-аў — калгасаў)...

У адказ у польскім Сойме стварылі камісію па падліку ваенных стратаў Польшчы. Выйшла лічба 40 млрд эўра. Але ж хто ім выплаціць такія грошы? Раней трэба было думаць — 40—50 гадоў таму. А раней яны падпісалі пад наглядам Саветаў некалькі дамоў з Заходняй ды Ўсходняй Нямеччынай — і абодва бакі нібыта ня маюць прэтэнзіяў. Нямеччына штосьці там сплачвае былым вязьням ды палонным. Таксама як у нас — толькі ў нас кінулі па 2—3 тысячы эўра, а там трошкі больш.

Між тым, у Польшчы гадоў 15 таму паўстаў Зьвяз выгнанцаў-крэсавякаў. Яны ў сваю чаргу складаюць пазовы ў суды аб страчаным на «крэсах» майне. І штосьці я ня чуў, каб наш урад гэта як-небудзь заўважаў. Ані ўрад Кебіча, ані Лукашэнкаў на гэта не рэагавалі. Мо думаюць, што «камень міма праляціць». Але гэта ня так. Гэтыя пытаньні ўсё роўна ўзьнікнуць, іх прыйдзецца вырашаць. Думаць, што схаваемся за шырокай сьпіной Масквы, — нонсэнс. Масква сама хоча нас паглынуць.

Калі мы зноў вернем Незалежнасьць, Дзяржаўнасьць, Волю, нам прыйдзецца абмяркоўваць з суседзямі шматлікія такія пытаньні. Ці гатовы мы да гэтага? Ці гатова наша дыпламатыя да гэтага? Ці зможам мы з гонарам, дастойна адстойваць свае інтарэсы?

Заадно выкажуся, што запіс у Канстытуцыі аб нашым нэўтралітэце вельмі слушны! Толькі нэўтралітэт выратуе нас ад усіх саюзаў, эўра- ды азіязьвязаў.

**Павал Тарасюк, Берасьце**

## Адкрыты ліст настаўніка гісторыі настаўніку гісторыі

Аляксандар Рыгоравіч! Я ніколі не галасавала за Вас, але як настаўніца гісторыі заўсёды казала, што абранаму прэзыдэнту трэба ня проста падначальвацца, а трэба добра вучыцца, потым добра працаваць, прытрымлівацца дысцыпліны ва ўсім: у працы, у жыцьці.

Пра Канстытуцыю я казала, што гэта — Асноўны закон краіны, дзе запісаны нашы правы і абавязкі. Я падкрэсьлівала, што калі мы ня будзем сумленна выконваць нашы абавязкі, то ня будуць у поўным аб'ёме рэалізаваны нашыя правы.

У Канстытуцыі запісана, што прэзыдэнтам любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа быць толькі два разы запар на пяць гадоў. Агулам 10 гадоў. А Вы ўжо зьмянялі Канстытуцыю, і цяпер зноў прагнеце новага тэрміну.

У нядзелю па радыё выступаў уладыка Філарэт. Сутнасьць ягонага выступу зьвялася да таго, што жыць трэба згодна з боскімі запаветамі, каб не было сорамна перад людзьмі, перад Богам. Дык хто даў Вам маральнае права мяняць Асноўны закон дзяржавы дзеля сваіх інтарэсаў? Мне сорамна глядзець у вочы сваім вучням...

У сваіх выступах вы часта прыгадваеце Бога. Так, Бог ёсьць на сьвеце, ён павінен абараніць нас ад Вашага жаданьня ўлады. Калі Вы верыце ў Бога, калі вы жадаеце шчасьця сваім дзецям, унукам і ўнучкам, выступіце перад нацыяй і скажыце, што Вы перадумалі.

А такім людзям, як А.Мядзьведзь, Л.Ярмошына, А.Ярмоленка, В.Сівохін, хочацца сказаць: перастаньце падлашчвацца да Лукашэнкі, займіце дастойную пазыцыю, бо вы цудоўна ведаеце, што з Канстытуцыяй нельга абыходзіцца так, як прабачце, з прастытуткай. Сёньня падмяў пад сябе адзін, заўтра другі. За вашу двудушнасьць вы і вашы дзеці адказваеце перад Усявышнім.

**В.Касавец, Пінск**

## Выхаваньне хлопчыкаў у Беларусі

У зьвыклых словах «Асьцярожна, дзьверы зачыняюцца! Наступная станцыя «Плошча Перамогі» ніколі б не здагадаўся шукаць патаемнага крамольнага сэнсу. Але аднойчы ў мэтро назіраў, як маладая маці ўшчувае свайго сыночка. Даня запытаўся голасна, ці будзе наступная станцыя перамогаю. Кабета рашуча запярэчыла свайму малагадоваму філёзафу: «Даня, сьледуюшчая станцыя называецца «Плошчадзь Пабеды», а не «Перамога!».

У гэтым зьвязку прыгадалася цікавая прыпавесьць пра слана. Нягледзячы на сваю моц, гэтая істота пры адсутнасьці гаспадара застаецца паслухмяна чакаць яго, прывязаная матузком да слупка. Слон будзе чакаць гаспадара ў любым выпадку, бо яшчэ жывыя ўспаміны пра тое, як у маленстве яго трымалі на цяжкім і вялікім ланцугу. Матузок на шыі дарослага зьяўляецца для яго ўсё тым жа ланцугом зь дзяцінства, які трэба рахмана несьці праз усё жыцьцё.

Боязь бацькоў, што іхныя дзеці («Крый божа!«) вырастуць непадобныя да свайго найбліжэйшага атачэньня, робіцца асноўным прынцыпам і падыходам у справе выхаваньня дзетак. Сюды ж дадаюцца і дзіцячыя страхі, што трансфармуюцца ў сталым узросьце ў камунікатыўныя праблемы, неадэкватную самаацэнку — і ў выніку ў нэўрозы. Для моцнай і творчай асобы нанканфармісцкія паводзіны могуць быць крыніцаю жыцьцёвае мудрасьці. Менавіта дзякуючы такім рыцарам духу і адбываюцца якія-колечы зьмяненьні ў грамадзкім жыцьці. Для няўпэўненага чалавека адхіленьні ад прынятых у грамадзтве нормаў могуць быць асабістым апакаліпсісам.

Ці палохалі ў дзяцінстве вас Бабаем? Як зробіш невялічкія правіны, адразу табе кажуць, што прыйдзе жудасны Бабай і схопіць непаслухмянца. Паратункам зьяўлялася заўжды ўпэўненая постаць таты, на тле якога ўсе бабаі рабіліся зусім ня страшнымі.

Сучасных дзетак палохаць Бабаем не выпадае — на ўсіх тэлеканалах, радыёстанцыях, ва ўсіх кнігарнях і дзяржустановах адчуваецца прысутнасьць першай асобы дзяржавы. Таму ня вельмі я зьдзівіўся, калі аднойчы прагледаў тэлепраграму з удзелам ППРБ разам з трохгадовым пляменьнікам, які без асаблівых ваганьняў узьняў сваю ручку ў бок экрана і гучна абвясьціў: «Глядзіце, Бабай!» Пераконваць хлопчыка ў адваротным я не гараў, тым больш што на самай справе раптоўна заўважыў падабенства сёньняшняга Галоўнага са сваім дзіцячым Бабаем...

Што да мяне, дык я набыў у падарунак свайму пляменьніку новую кніжку казак Пятра Васючэнкі. Наступнай станцыяй будзе перамога!

**Віктар Яроцкі, Менск**

## Фэдэрацыя на маршы

Кіраўніцтва Фэдэрацыі прафсаюзаў надрукавала і даслала ў «нізы» маляўнічыя плякаты-агіткі з тэкстамі гімну і маршу свайго дзецішча. Два такія плякаты вэтэраны вайны і працы, што прыехалі на адпачынак і лячэньне ў санаторый «Беразіна» каля Барысава, убачылі пры ўваходзе ў галоўны корпус лячэбніцы. Словы і музыка першага гімну належаць, як сьведачаць плякаты, І.Вейціку, словы другога напісаў П.Саковіч, музыку — Э.Зарыцкі. Гімны не прыцягнулі ўвагі бальшыні пажылых людзей, якім яны, як кажуць, «да лямпачкі».

Фэдэрацыя на маршы,
Зь ёю кожны прафсаюз,
Мужнасьць нашу, мэты нашы
Паважае Беларусь —

і г.д. Толькі знаёмыя мне суседзі па абедзеным століку лячэбніцы гаварылі, між іншым, што пасьля падпісаньня работнікам кантракту дырэктар прадпрыемства можа звольніць яго, калі пачуе ад таго нейкую крытыку ў свой адрас, — і ніякі дзяржаўны прафсаюз яму не дапаможа, а марш і гімн настрою ня ўздымуць.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Выдавецкія ўтопіі

Якія кнігі або пэрыядычныя выданьні я хацеў бы бачыць у Беларусі?

1) «Ёсьць жа яшчэ ў мяне сіла». Анталёгія, прысьвечаная ўзаемаадносінам улады й літаратуры ў Беларусі (1917—56). Утрымлівае антысавецкія творы Я.Купалы, Я.Коласа, У.Дубоўкі, А.Дудара, С.Пярловіча і інш. Выступы супраць русіфікацыі, або нацыянал-камунізм у літаратуры: «Ліст трох», «Тэатральная дыскусія», лісты Коласа ў ЦК, М.Лынькова — П.Панамарэнку. Улада супраць нацыяналізму. Паводле матэрыялаў Мясьнікова, Кнорына, Апанскага, Затонскага, Панамарэнкі.

2) Вынішчэньне. Матэрыялы са справаў арыштаваных пісьменьнікаў.

2) «Маўр» — беларускі часопіс, прысьвечаны замежжу. Зьмяшчае агляд міжнародных культурных і палітычных падзей, пераклады твораў замежнай літаратуры, этнаграфічныя і гістарычныя матэрыялы. Асаблівая ўвага надаецца беларуска-замежным сувязям.

Заклікаю выказацца на гэтую тэму і іншых.

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА АПАЗЫЦЫІ

### Інтэрнэт і апазыцыя

На мой погляд, дэмакратычныя сілы ў Беларусі недастаткова выкарыстоўваюць сучасныя тэхналёгіі. Значная частка насельніцтва мае доступ да Інтэрнэту і прынтэраў. Чаму б на сайтах (накшталт www.batke.net і www.lukamor.info) не разьмяшчаць тэкстаў улётак, якія людзі маглі б раздрукаваць і раскідаць хаця б у паштовыя скрынкі сваіх суседзяў па пад'ездзе? Гэта радыкальна павялічвае магчымасьці данесьці сваю пазыцыю да іншых людзей, большасьць якіх знаходзяцца ў стане інфармацыйнай блякады. Пры гэтым важна, каб на гэных сайтах была «вэрсія для друку», якая б зьмяшчалася на адным аркушы стандартнага памеру.

Апроч гэтага, можна выкарыстоўваць дасыланьне sms-паведамленьняў з інтэрнэт-старонак на мабільныя тэлефоны знаёмых людзей з патрэбнай інфармацыяй альбо заклікамі.

Кандыдатам у дэпутаты ня варта забываць пра тэлефонныя базы выбарцаў. Маёй бабульцы, напрыклад, ужо тэлефанавалі дамоў «афіцыйныя» людзі і клапаціліся наконт таго, каб яна пайшла на рэфэрэндум і «правільна» прагаласавала.

**А.Астапенка, Менск**

## З ГІСТОРЫІ

### Першыя выбары і першыя байкоты

Калі былі першыя выбары, я яшчэ не галасавала. Хоць і была ўжо замужам.

1936 год. Мне на права голасу не хапала цэлага году. Але тыя выбары я добра помню.

Людзі баяліся галасаваць. А чаму баяліся? Тое галасаваньне ладзілася ў царкве, якую камісары пад клюб пусьцілі. Людзі казалі: ладзіць выбары ў царкве — гэта блюзьнерства, вялікі грэх перад Богам, зьдзек зь яго. Галасаваць у царкве — значыць душу нячысьціку аддаць, прадаць. Шмат хто, каго ўсё ж змушалі пад рознай пагрозай галасаваць, падалі перад царкоўным цывінтаром ніц і шапталі: «Даруй нам, Божа, грэх вялікі!» З гэтымі словамі яны заходзілі, баязьліва здраньцьвелыя, на выбарчы ўчастак. А самыя зацятыя, каб не награшыць перад Богам, зьбягалі ў лес і, пакуль тыя выбары ладзіліся, сядзелі там. І толькі назаўтра, па досьвітку, крадком вярталіся дадому і сядзелі ў сваіх хатах ціха, як мышы пад венікам. Носу не паказвалі на людзі, баючыся, што нехта прыйдзе зь сельсавету і сурова папытаецца: «Гэта ж чаму вы, галубочкі, не галасавалі, выбары нам зрывалі?» Але, хвала Богу, усё пакуль абыходзілася: байкотчыкаў першых выбараў не чапалі, ня кралі, толькі ўсчуалі. Іхні байкот сышоў ім на той раз з рук. Адно па хатах хадзілі па тры-чатыры разы, угаворвалі, каб ішлі галасаваць на ўчастак ці прагасавалі хоць тут, балазе скрыня з сабою. Але і гэта шмат каму мала памагло: пасклaдаюць рукі крыж-накрыж на грудзях, каб часам ім тыя чортавы біюлетэні ў рукі ня ўсунулі, і рабі зь імі хоць што хочаш...

От такія былі першыя выбары ў нашым Мормалі, што між Жлобінам і Шапілкамі, цяпер Сьветлагорскам. Выбіралі тады якогась Гардзеева, нейкага вяскоўца, якога ніхто ня ведаў.

**Расказала Саня Содаль з Карабанавых, 1919 г. нар.**
**Запісаў яе сын Уладзімер Содаль**

## ФРАЗА

У дзяржаўнай прэсе — каляровая хлусьня, у апазыцыйнай — чорна-белая праўда.

**Марыя Бойчык, Менск**

## ЖАРТ

17 кастрычніка, 22.00.

— Аляксандар Рыгоравіч, у мяне для вас дзьве навіны, добрая і дрэнная.

— Давайце з дрэннай, Лідзія.

— «Не» пазначылі 65 працэнтаў тых, што ўзялі ўдзел у галасаваньні.

— Няўжо пасьля гэтага нас можа чакаць нешта добрае?

— Але пасьля падліку галасоў Цэнтравыбаркамам аказалася, што за ўнясеньне зьменаў у Канстытуцыю выказаўся 71% ад сьпісу выбарцаў.

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У №36 прайшла памылка: на с.12 трэба чытаць Андрэй Александровіч, а не Алесь Александровіч.

У №35 па віне аўтара на с.6 здарылася памылка, якая ўносіць сэнсавую блытаніну: замест «...у рэгістрацыйных дакумэнтах У.Канаплёў фігуруе як беспрацоўны» трэба чытаць «...у рэгістрацыйных дакумэнтах У.Канаплёў фігуруе як беспартыйны».

# Валянцін Стэфановіч: Кола маіх сяброў — гэта дзяржава ў дзяржаве

**У Беларусі шмат праваабаронцаў. Аднак я ведаю ў Беларусі толькі аднаго праваабаронцу, які не вагаецца і з кулакамі адбіваць у амонаўцаў незаконна затрыманых школьнікаў — гэта Валік Стэфановіч. Ён ня толькі апантаны змагар за годнасьць чалавека. Яшчэ Валянцін на сёньня найлепшы ў Беларусі спэцыяліст па выбарчым заканадаўстве. Ён на свае вочы бачыў выбары ў Косаве, Сэрбіі і іншых гарачых зонах. А пачыналася ўсё вясной 1996 г., калі студэнт юрфаку БДУ на мітынгах змагаўся з АМОНам.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Плошча Якуба Коласа, 21 ліпеня 2004 году.

**«НН»: Выраз «абаронца правоў чалавека» гучыць вельмі рамантычна: гэта высакародны чалавек, які дапамагае іншым. У той жа час «правы чалавека» сталі штампам, дышлам, якое можна павяртаць у любы бок, а для БТ — і наагул лаянкавым выразам… Вось ты сваёй дзейнасьцю дапамог нейкім канкрэтным людзям?**

**Валянцін Стэфановіч:** Для кагосьці з палітыкаў правы чалавека — гэта нейкі надуманы стандарт, які можна выкарыстоўваць у сваіх мэтах. Для мяне ж асабіста за шэсьць гадоў, што я займаюся правамі чалавека, гэта стала азначаць канкрэтную праблему канкрэтнага чалавека, калі ён сутыкаецца зь дзяржаўнай машынай, чынавенствам і ня можа адстойваць сваю пазыцыю, свае правы. Я адчуў гэта на сваёй скуры вясною 1996 г., калі на маіх вачах людзей зьбівалі і затрымлівалі. Я сам у 1997 г. пяць сутак праседзеў пад арыштам.

На «Вясьне» ў нас заўсёды сьвята, калі ўдаецца спыніць нейкую палітычна матываваную крымінальную справу ці мінімізаваць яе вынікі, калі простыя людзі гавораць нам «дзякуй». Вось справа аднаго ліквідатара-чарнобыльца. Ён быў мабілізаваны з запасу, працаваў непасрэдна каля рэактара, але пропуск яму зь неразьбярыхі выпісалі ў Прыпяць, а потым чыноўнікі падзялілі зону на падзоны і атрымалася, што ён ня мае права на пэнсію. Мы ў судовым парадку даказалі, што ён там быў і мае права на пэнсію. Яму пачалі яе выплачваць. Вось справы праваабаронцаў.

**«НН»: Абарона правоў чалавека — гэта прафэсія?**

**ВС:** Я б не хацеў, каб гэта была прафэсія. Прафэсія — адвакат, юрыст, а праваабаронца — гэта грамадзкая дзейнасьць. Хаця як юрысту мая дзейнасьць у «Вясьне» дала мне досьвед. Мая спэцыяльнасьць — «адвакацка-натарыяльная дзейнасьць». У будучыні я хацеў бы займацца адвакацкай дзейнасьцю. Сытуацыя трохі зьменіцца — і ў мяне зьявіцца магчымасьць атрымаць ліцэнзію. Але праваабарончая дзейнасьць дазваляе глядзець на праблему больш шырока.

**«НН»: Абарона чужых правоў — гэта характар?**

**ВС:** Гэта пакліканьне. У Маскоўскай праваабарончай групе ў савецкі час не было юрыстаў паводле адукацыі. Так і наша задача сёньня — ня толькі юрыдычная дапамога і збор інфармацыі, але таксама збор сродкаў сем'ям пацярпелых, зьніклых. Каб людзям перажыць цяжкую часіну.

**«НН»: Што рабіць у будучыні зь беларускай судовай сыстэмай? Што будзе з тымі людзьмі, якія цяпер у дзяржаўных органах як сьледчыя ці судзьдзі выконваюць загады?**

**ВС:** Пытаньне істотнае. Усю сыстэму, усіх судзьдзяў, не заменіш, гэта нерэальна. Але трэба будзе мяняць усіх старшыняў абласных судоў і Вярхоўнага Суду, кіраўнічы эшалён Мінюсту і Канстытуцыйны Суд, а таксама абавязкова мяняць судовую сыстэму, прымаць новае заканадаўства. Задачай такой рэформы будзе замацаваньне мэханізмаў незалежнасьці судовай сыстэмы, каб пазбавіць выканаўчую ўладу магчымасьці ціску на судзьдзяў. Калі будзе пабудавана сыстэма, то судзьдзі ў яе ўпішуцца і будуць сумленна працаваць: у нас шмат адукаваных людзей у гэтай сфэры. Калі будзе даказана, што некаторыя судзьдзі выносілі заведама незаконныя палітычна матываваныя судовыя рашэньні, — я мяркую, што гэтым судзьдзям ня месца ў сыстэме юстыцыі.

**«НН»: Ёсьць шмат людзей, якія хацелі б быць юрыстамі, але ня згодны з той прававой сыстэмай, якая існуе. Што ім рабіць?**

**ВС:** Пазыцыя бальшыні юрыстаў такая: я выконваю заканадаўства, добрае яно ці дрэннае. Я ведаю, што ў пракуратуры і судах ёсьць разумныя людзі, якія разумеюць, што адбываецца. Але студэнты сапраўды вывучаюць тое, што ёсьць, і гэта ў пэўным сэнсе нараджае такі прававы нігілізм: калі Канстытуцыя на маіх вачах перапісваецца двойчы і перакройваецца пад аднаго чалавека, дык узьнікае думка — калі можна так абыходзіцца з Канстытуцыяй аднаму, чаму нельга ўсім астатнім? Калі я вучыўся ва ўнівэрсытэце, я для сябе вырашыў, што ня буду працаваць дзяржаўным службоўцам у такой прававой сыстэме.

**«НН»: Як жывуць і працуюць праваабаронцы пасьля разгрому праваабарончага руху ў 2003 годзе?**

**ВС:** Тое, што адбылося летась і сёлета, сумна. Ліквідаваны ўсе праваабарончыя арганізацыі, дайшла чарга і да БХК. Улады выпіхваюць нас з прававога поля. Ці азначае гэта, што мы спынім дзейнасьць? Натуральна, не. Усе працягваюць працаваць па-ранейшаму, і я не сумняваюся, што БХК, калі ён будзе зачынены, таксама прадоўжыць дзейнасьць. Зьявіліся нейкія нюансы: трэба быць асьцярожным, калі робіш нейкія заявы ад імя арганізацыі. Але гэта ўжо не СССР, у нас ёсьць іншыя магчымасьці працы — напрыклад, распаўсюджваць інфармацыю праз Інтэрнэт. Ад таго, што зрабілі ўлады, праваабарончы рух толькі набудзе іншыя формы.

**«НН»: Ці дапамагае табе ў штодзённым жыцьці твая юрыдычная адукацыя і праваабарончая спрактыкаванасьць?**

**ВС:** На жаль, сапраўды дапамагае. Мяне затрымлівалі толькі ў гэтым годзе 2-3 разы, але ні разу не пасадзілі на суткі. Я ведаю свае правы, упэўнена сябе адчуваю, не баюся.

**«НН»: Ты шмат бываеш у іншых краінах, назіраеш на выбарах. Параўнаньне Беларусі зь іншымі дзяржавамі надае пэсымізму ці аптымізму?**

**ВС:** Калі параўноўваць з краінамі былога СССР, дык сытуацыя паўсюль прыкладна аднолькавая, калі не лічыць Прыбалтыкі. Але наша грамадзтва больш сасьпела, чым, напрыклад, у Сярэдняй Азіі ці нават у Расеі. Расейцы хочуць захаваць імпэрыю, для іх пусты гук правы чалавека, а значыць, і яго жыцьцё. У нас расьце новае пакаленьне моладзі, і я вельмі спадзяюся на гэты перапалом. Моладзь — гэта іншыя людзі, чым тыя, хто выхоўваўся ў СССР. Нават БРСМ ня можа нічога зрабіць, таму што гэта ўтварэньне куды больш фармальнае, чым нават камсамол.

**«НН»: Якія твае захапленьні?**

**ВС:** Я шмат чытаю. На жаль, перад выбарамі — усё больш Выбарчы кодэкс, але мне вельмі пашанцавала зь «Вясной»: я сустрэў там людзей, якія займаліся і займаюцца беларускай культурай, літаратурай, і гэта мяне адукоўвае.

Маё кола знаёмых — гэта «прызыўнікі менскай «Вясны-96». Увогуле, адтуль мае цяперашнія сябры. Для мяне шмат значыць гэты пэрыяд майго жыцьця. Менавіта ў гэты час я пазнаёміўся са сваёй жонкай Алінай. Для мяне важна, што ёсьць кола людзей, зь якімі можна гаварыць па-беларуску. Часам узьнікае ўражаньне, што я жыву ў дыяспары ў нейкай чужой дзяржаве. Я хачу, каб нашы дзеці таксама гадаваліся разам, каб мелі нейкую беларускамоўную супольнасьць. Нашы дзеці павінны мець права на выхаваньне ў роднай мове.

**Гутарыла**
**Вераніка Дзядок**

**Валянцін Стэфановіч** нарадзіўся ў 1972 у Менску. Скончыў сярэднюю школу, два гады адслужыў у савецкім войску ў Лідзе. У 1998 скончыў юрфак БДУ, паўгоду працаваў юрыстам на Падшыпнікавым заводзе, з 1998 зьяўляецца сябром праваабарончага цэнтру «Вясна», які быў ліквідаваны ўладамі як «няўгодны». Тры гады выкладаў у Беларускім ліцэі.

### Тэатры

**Опэра**

**9** (сб) — «Царская нявеста».
**10** (ндз) — «Вясельле Фігаро».
**12** (аўт) — «Князь Ігар».
**14** (чц) — канцэрт «Гучыць раманс».
**16** (сб) — «Турандот».

**Сучасны мастацкі тэатар**

**16** (сб) — «Мяшчанскае вясельле».
**17** (ндз) — «Усе хлопчыкі — дурні».

**Новы драматычны тэатар**

**8** (пт) — «Ня бойся быць шчасьлівым».
**11** (пн) — «Гарбата з вэрблюдам».
**12** (аўт) — «Рамантыкі».
**13** (ср) — «Шалёныя грошы».
**14** (чц) — «Дазвольце спадзявацца».
**15** (пт) — «Квадратура кола».

**Тэатар эстрады**

**9** (сб) — «Цыганскія напевы».
**14** (чц) — «Эстрадны кактэйль».
**15** (пт) — «Белы голуб».

**Моладзевы тэатар**

**7** (чц), **8** (пт), **17** (ндз) — «Лейтэнант Валодзька».
**9** (сб) — «Пігмаліён».
**10** (ндз), **15** (пт) — «Тойбэле і яго дэман».
**12** (аўт) — «Вар'яцкі дзень, альбо Вясельле Фігаро».
**13** (ср) — «Хітрыкі Скапэна».
**14** (чц) — «На вачох у жаночай берагавой аховы».
**16** (сб) — «Знаходлівая закаханая».

**Фігурнае катаньне**

**9** (сб) — Палац спорту. Галапрадстаўленьне зорак фігурнага катаньня.

### Канцэрты

**9** (сб), 19.00 — «Начныя снайпэры». Канцэртная заля «Менск». Квіткі: 20000—60000 руб.
**10** (ндз), 19.00 — «Сакрэт», «Пікнік». Вялікая юбілейная праграма. Канцэртная заля «Менск». Квіткі: 18000—50000 руб.
**9** (сб) — канцэрт Валер'я Лявонцьева «Начны візыт». Палац Рэспублікі. Квіткі: 28000 — 140000 руб.

### Выставы

**«БелТэкслегпрам»**

**З 12 да 15 кастрычніка** ў выставачных павільёнах на Машэрава, 14 і Я.Купалы, 27 адбудзецца 15-я міжнародная выстава-кірмаш «БелТэкслегпрам». Падчас выставы адбудуцца прэзэнтацыі фірмаў-удзельніц, паказы калекцый вопраткі і абутку.

**Графіка студэнтаў**

У «М-Галерэі» Інстытуту імя Гётэ (вул.Фрунзэ, 5) працуе выстава графікі студэнтаў-графікаў Акадэміі мастацтваў «Новая вандроўка». Выстава працуе **да 8 лістапада**.

**Інтэрнацыянальны Джойс**

У галерэі ЭГУ (пр.Ф.Скарыны, 24) **да 24 кастрычніка** працуе выстава «Інтэрнацыянальны Джойс», прысьвечаная жыцьцю і творчасьці пісьменьніка. Уваход вольны.

**Беларускі горад XIX — пачатку XX ст.**

У Музэі гісторыі і культуры Беларусі адкрылася сталая выстава «Мастацтва ў гарадзкой культуры XIX — пачатку XX стагодзьдзя». Экспазыцыю складаюць калекцыі з фондаў музэю, графіка, жывапіс, фатаздымкі, паштоўкі, дакумэнты, мэбля, музычныя інструмэнты, вопратка. Выстава — першая частка праекту «Беларускі горад XIX — пачатку XX ст.». Квіткі: 2000.

**Неспадзяванае — «Край»**

**9 кастрычніка** ў 16 гадзін творчая гасьцёўня «Маладзік» ладзіць сустрэчу з нагоды выхаду кніг Алеся Камоцкага «Неспадзяванае» і Вадзіма Грудзьева «Край». Сустрэча адбудзецца ў кіналекцыйнай залі Палацу дзяцей і моладзі ў Менску (Старавіленскі тракт, 41, праезд трамваямі №3, 4, 5, 10 да прып. «Палац моладзі»). Квіткі й даведкі праз т.262-02-90.

**Aller et retour**

Галерэя візуальных мастацтваў «Nova» (В.Харужай, 16) запрашае на выставу фатаздымкаў Філіпа Эрбэ (Бэльгія) «Aller et retour / Туды і назад». Адкрыцьцё выставы і сустрэча з аўтарам адбудуцца **8 кастрычніка** а 17-й гадзіне. Выстава працуе да 12 лістапада.

**«Восень-2004»**

У Палацы мастацтваў **да 10 кастрычніка** працуе выстава Саюзу мастакоў «Восень-2004». Экспануецца інсталяцыя, графіка, скульптура, дэкаратыўнавыяўленчае мастацтва.

### Клюбнае жыцьцё

**Графіці (671-58-65)**

**12** (аўт), 20.00 — парталу беларускай музыкі «Слыхаву апарат» — 1 год.
**13** (ср), 20.00 — вечар джазавай музыкі.

**Bronx (288-10-61, velcom: 103 і 105)**

**7** (чц), 22.00 — «Клюбны чацьвер».

**Белая Вежа (284-69-22, 239-16-00)**

**7** (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Bergamo.
**8** (пт), 24.00 — дыскатэка «Euroclub»: dj Mixell, go-go.

**Гудвін (226-13-06)**

**7** (чц), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джаз-квартэт.
**8** (пт), 21.00 — жывая музыка: «Мадэра Хард Блюз».

**Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)**

**7** (чц), 23.00 — dj Egor.

**X-Ray (223-93-55)**

**8** (пт), 22.00 — dj-bar.

### Менская кінаафіша з 8 да 10 кастрычніка

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Прынц і я» (прэм'ера): **8** (пт) 16.30; **9, 10** (сб, ндз) 14.10, 16.30.
«Прадвесьнікі буры» (прэм'ера): **8** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Наталі»***: **8—10** (пт—ндз) 18.50, 20.50.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **8** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Шрэк-2»: **8** (пт) 18.00 (іл); **9, 10** (сб, ндз) 18.00.
«Шырокім крокам»***: **8, 9** (пт, сб) 20.00; **3** (ндз) 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Дзевяць ярдаў-2» (прэм'ера): **8** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Дзевяць ярдаў-2» (прэм'ера): **8** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **8** (пт) 16.40, 19.00 21.20; **9, 10** (пт, сб) 14.00 (іл), 16.40, 19.00, 21.20.
«Кіроўца для Веры» (прэм'ера): **8—10** (пт—ндз) 18.20, 20.20.
«Весьягонская ваўчыца»: **8—10** (пт—ндз) 16.00.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **8** (пт) 16.00, 18.40; **9, 10** (сб, ндз) 13.50, 16.20 (іл).
«Эўратур»***: **8** (пт) 21.10; **9, 10** (сб, ндз) 19.00, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Стэпфардзкія жонкі»: **8** (пт) 14.30, 16.20, 21.00, **9, 10** (сб, ндз) 16.20, 21.00.
«Троя»: **8—10** (пт—ндз) 18.15.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Тата» (прэм'ера): **8** (пт) 13.00, 17.00; **9, 10** (сб, ндз) 15.00 (іл), 19.00.
«Шрэк-2»: **8** (пт) 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 11.00, 15.00; **9, 10** (сб, ндз) 13.00, 17.00.
«Шырокім крокам»***: **8** (пт) 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 11.00, 21.00.
«Парнаграфія»: **8** (пт) 19.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

### Для дзяцей

**Опэра**

**17** (ндз) — «Кот у ботах».

**Новы драматычны тэатар**

**9** (сб) — «Чараўнік Батафога».
**16** (сб) — «Чароўная скрыпка».

**Моладзевы тэатар**

**10** (ндз) — «На шчупакоў загад».

**Тэатар юнага гледача**

**8** (пт), 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой» (з 9 гадоў).
**9** (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка» (з 10 гадоў).
**10** (ндз), 11.00 — «Залатое сэрцайка» (з 5 гадоў).
**10** (ндз), 14.00 — «Паліяна» (з 9 гадоў).
**12** (аўт), 18.00 — «Тарас на Парнасе» (з 14 гадоў).
**13** (ср), **14** (чц),18.00 — «Паганага нораву годныя вынікі» (з 14 гадоў).
**15** (пт), 14.00, 18.00 — «Рыцар Ордэну Сонца» (з 12 гадоў).
**16** (сб), 11.00, 14.00 — «Палачанка» (з 14 гадоў).
**16** (сб), 19.00 — «Апошняя дуэль» (з 15 гадоў).
**17** (ндз), 11.00, 14.00 — «Дзень нараджэньня ката Леапольда» (з 9 гадоў).

**Кіно**

**«Аўрора»**
«Маленькі Сьцюарт-2»: **8** (пт) 14.30; **9, 10** (сб, ндз) 12.30.

**«Берасьце»**
«У краіне нявывучаных урокаў» (мультзборнік): **9, 10** (сб, ндз) 11.50.

**«Дружба»**
«Карлік Нос»: **8—10** (пт—ндз) 12.00.
«Эліна, нібы мяне і не было»: **8—10** (пт—ндз) 14.00.

**«Мір»**
«Лебядзінае возера»: **9, 10** (сб, ндз) 12.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **9, 10** (сб, ндз) 13.30.

**«Піянер»**
«Легенда пра рыцара»: **8** (пт) 11.10; **9** (сб) 10.30; **10** (ндз) 10.30; 14.00.
«Бальная сукенка»: **9** (сб) 14.00; **10** (ндз) 12.00.

КУЛЬТУРА МАС

# Скрынка Пандоры



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Працяг са старонкі 2.**

Першую п'есу на індаэўрапейскім эспэранта (ангельская, нямецкая ды расейская салянка) — «Але, калі ласка, са шлягерам» — прэзэнтавалі тэатралы з швайцарскага «Die stralenden Herzen» («Бліскучыя сэрцы»). Камэдыя са скокамі, сьпевамі ды эксперымэнтамі сьцьвярджала, што сучасная паненцы трэба шакаляд і мужчына (шкала каштоўнасьцяў зацьверджаная фэміністкамі). Меркавалася, што менавіта яны затарабаняць на радзіму прыз фэстывалю — таемны куфар (беларусы, пэўна, згадалі казку пра цікаўнага бусла, што сунуў дзюбу ў божы мех з гадаўём, ці гэткую ж вясёлую гісторыю пра скрыначку, наладаваную гексагенам, ды вырашылі абавязкова сплавіць падазроны прадмет з гістарычнае радзімы).

Брацкія пачуцьці перамаглі, і куфар у апошні момант вырашылі прысудзіць тэатру Цэнтру эстэтычнага выхаваньня й разьвіцьця асобы з Санкт-Пецярбургу. 30 верасьня той прэзэнтаваў спэктакль «Казка» паводле апавяданьня У.Набокава. Менчукі вылупляліся на экзатычныя дэкарацыі, бы Халімон на каранацыі, цішком шапталіся, што «швайцарцы тожа малайцы», а псыхатэрапэўты ставілі выканаўцам дыягназ: тыя казалі пра сябе ў трэцяй асобе.

Самымі вялікімі малайцамі, натуральна, выступалі студэнты БДУ. Апрача зьдзеклівага на адкрыцьці забойства агента варожае буржуазнае краіны, тэатар «На бальконе» прадэманстраваў чатыры пастаноўкі: «3N, ці Nешта Nявыказанае Nамі» (паводле п'есы Т.Уільямса), «Cinema-тэатар» (мікс твораў Бэрнарда Шоў «Чаму яна не пажадала» ды Зошчанкі), «Жарты пра каханьне» (паводле Чэхава) ды «Ілюзіён» (паводле сумнавядомага А.Курэйчыка).

«3N» прыкула хатніх гаспадыняў да сцэны: гаворка вялася пра каханьне-нянавісьць дзьвюх лесьбіянак. Бэрнард Шоў баяў пра нязломную жанчыну, што не ахвяруе сваёй свабодай дзеля шлюбу (авацыі ды тупаньне нагамі недабітых фэміністак). «Ілюзіён» спрабаваў стварыць ілюзію якаснае п'есы.

Наіўная гісторыя пра падшпаркаў з ангельскага каледжу, якія надумаліся (што ён Гекубе, што яму Гекуба?) зладзіць свой цырк. Завяршаецца пастанова сьлязьлівым скаваттаньнем над закохатай падчас фокусу акторкай. Каб дзейства працягнулася шчэ паўгадзіны, гэты прысуд выканалі б гледачы над галоўным ілюзіяністам. На запытаньне, чаму абраны менавіта гэты аўтар, адзін з актораў лыкае ёгурт (100 літраў «Алівары») выкулюдзіў падчас адкрыцьця) ды паныла адказвае: «Загадалі — і паставілі».

Бурлескава-лубочнае м'юзык-шоў паводле «Казкі пра папа і яго нага работніка Балду» Пушкіна спарадзіў Народны студэнцкі паэтычны тэатар БДТУ «Звон». Назва адпавядае зьмесьцу ды адлюстроўвае становішча нацыянальнае культуры. Большасьць рэжысэраў чуюць водгульле звону, што склікае «на сход, па Бацькаўшчыну», ды не ўсьведамляюць слушнага кірунку. І ператвараюцца то ў -нацыяты першахрысьціцеляў, то ў Балду, што дарэмна грукаецца галавой аб мур.

Скандальна вядомая «Лісыстрата», створаная паводле п'есы Л.Філатава намаганьнямі Народнага студэнцкага музычна-драматычнага тэатру БДУ «На філфаку», даўно мае сваіх заўзятараў ды крытыкаў. Дзетак лепш туды не пускаць. І прыхапіць колькі хусьцінак (зьбіраць сьлёзы рогату ці плачу над лёсам тэатру) ці цэляфанавых торбачак (без камэнтароў).

Найбольшае ўражаньне пакінуў спэктакль «Гульні багоў» (п'еса слыннага швайцарскага драматурга К.Халера), а таксама «Чума на абодва вашы дамы» Р.Горына, прэзэнтаваная Народным студэнцкім музычна-драматычным тэатрам БДУ «На філфаку» (спроба дапісаць Шэкспіравых «Рамэо і Джульету»). Першая зьдзівіла майстэрствам выкананьня, другая — нахабствам аўтара.

Каб суцешыць таго, хто прапусьціў гэтую падзею, варта адзначыць, што большасьць пастановак, бы хваробы са скрынкі Пандоры, павыпаўзалі з куфэрку й будуць і далей дэманстравацца ў менскіх ВНУ. Сачыце за скупой рэклямай. Відовішчы сьвежыя і ўзрушаюць.

**Болачка**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Крылы назаўжды

«Ліля назаўжды» («Lilja 4-ever»)
Данія—Швэцыя, 2002, каляровы, 109 хв.
**Жанр:** сацыяльная драма.
**Адзнака:** 6,5 (з 10).

Скандальны швэдзкі рэжысэр Лукас Мудысон (ніякіх паралеляў, калі ласка), вядомы па карціне «Fucking Emel» (у расейскім і нашых пракатах — «Пакажы мне любоў») пра дзяўчынак-лесьбіянак, зацкаваных грамадзтвам, знайшоў цэлую тэрыторыю занядбаньня — руіны былой савецкай імпэрыі. Асобныя расейскія крытыкі ўжо выказалі сваю незадаволенасьць такім выбарам, бо абшарпаныя пад'езды, засцаныя коўдры і нялюдзкія ўчынкі нагадалі ім дарагую Радзіму.

Але на гэтай радзіме жывуць патэнцыйныя анёлы, якія марыць, дыхаюць і, бездапаможныя, ператвараюцца ў ахвяры дзіцячай прастытуцыі.

16-гадовую Лілю кінула маці, бо зьехала ў Амэрыку з палюбоўнікам. Цётка выставіла дзяўчынку з кватэры, а найлепшая сяброўка абыякавала. У Лілі аніхога не застаецца, акрамя закаханага ў яе 11-гадовага Вовы, зь якім яна летуценна фантазіруе. Калі новы сябар Андрэй абяцае ёй працу ў Швэцыі, Ліля шчасьлівая, але гэта пастка сэксуальнага рабства.

Дзеці-акторы ў карціне моцныя й таленавітыя, а Аксана Акіньшына ператварылася ў зорку.

Калектыўны партрэт злачыннага юру з потнымі і сіплымі тварамі, тлустымі целамі, хрыплымі й сьлюнявымі вуснамі — гэта разьлічаны глядацкі шок. А ўцёкі дзяўчынкі пад музыку «Rammstein» — апошні скачок нявіннага анёла.



WWW.DVDBEAVER.COM

І хаця нельга не разумець, што фільм Мудысона — агітацыйная ўлётка, жорсткая сацыяльная дэкларацыя, эмоцыі працінаюць.

У адрозьненьне ад беларускіх кіношнікаў, якія выкарыстоўваюць лагодных дзетак у канвэрнай вытворчасьці фальшывых цукерак, швэдзкі рэжысэр не саромеецца з размаху біць у сонечнае сплячэньне — каб выклікаць горкія сьлёзы і спачуваньне.

**Андрэй Расінскі**

# «Мы ўсе глядзім у Напалеоны...»

Напярэдадні выбараў ды рэфэрэндуму Воршу наведала інфармацыйна-прапагандысцкая група зь Менску на чале з намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Мікалаем Іванчанкам. Намэнклятурны «дэсант» быў надта прадстаўнічым: 12 міністраў, іхныя намесьнікі, іншыя важныя чыноўнікі. Сталічныя прапагандысты выступілі ў працоўных калектывах прадпрыемстваў ды ўстаноў гораду.

Расьпісваючы дасягненьні краіны за час 10-гадовага праўленьня А.Лукашэнкі, яны заклікалі прысутных станоўча адказаць на пытаньне абвешчанага рэфэрэндуму. Шмат цікавага пачулі аршанцы ад высокіх менскіх гасьцей. Так, першы намесьнік міністра культуры **Ўладзімер Рылатка** (на фота справа) расказаў работнікам жыльлёва-камунальнай гаспадаркі пра тое, што ў ЗША прэзыдэнта выбіраюць усяго 10—12% насельніцтва, а грамадзяне Швайцарыі наагул ня ведаюць свайго прэзыдэнта. Ад гэтага, відаць, і нешчасьлівыя. Ня тое што ў нас. Са шчырым хваласьпевам на адрас А.Лукашэнкі выступіў перад калектывам ільнокамбінату старшыня Белдзяржтэлерадыёкампаніі **Ўладзімер Мацьвяйчук** (на фота зьлева). Ён між іншым паведаміў пра распарадак дня прэзыдэнта, асабліва адзначыўшы яго цудоўную фізычную форму і здароўе: «Прэзыдэнт выйграе ў кожнага спартоўца ды аматара фізкультуры... Няма ніводнага дня, — працягваў галоўны тэлевізійны начальнік, — каб прэзыдэнт не займаўся фізкультурай. Працоўны дзень яго пачынаецца з 9 гадзін, і да 18.00 ён працуе ў рэзыдэнцыі, праводзіць афіцыйныя сустрэчы. З 18-і — сустрэчы ў працоўных калектывах, праверкі, справаздачы падначаленых, паездкі. З 21.00 да 24.00 — праца з дакумэнтамі. З 1.00 да 5.30 адбой, сон. Я гэты рэжым добра ведаю. Прэзыдэнт працуе за дваіх, за траіх чалавек…» Трэба разумець, з 5.30 да 9.00 ён займаецца спортам ды сілкуецца. Здаецца, усяго 4 гадзіны ў суткі спаў Напалеон. Чым ён скончыў — усім вядома.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Перадвыбарная праграма

фэльетон

Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў наша газэта зацікавілася, якія пункты перадвыбарнай праграмы мусіць мець кандыдат, каб у яго былі шанцы стаць чалавекам №1 у краіне. На нашую просьбу PR-тэхнолягі ласкава падзяліліся так званай «формулай посьпеху».

Такім чынам, кандыдат у прэзыдэнты мусіць:

1) казаць, што, калі ён стане прэзыдэнтам, у краіне ня будзе вайны, а то, крый божа, аберацэ якога генэрала-га득оўніка, які без ваенных дзеяньняў ня можа жыць, а ён возьме ды адправіць беларускіх хлапцоў у Ірак;

2) гаварыць, што будзе і надалей плаціць пэнсіі. Хай малыя, але ж яны ўсё роўна ёсьць. Іншы хто мо ўвогуле плаціць ня будзе;

3) абяцаць захаваць бясплатную мэдыцыну і адукацыю. А калі і прыйдзецца заплаціць у больніцы пару мільёнаў за апэрацыю ці ў школе здаць на рамонт кабінэту раз у год — гэта дробязь. Мэдыцына і адукацыя ўсё адно будуць бясплатнымі;

4) абяцаць падняць сельскую гаспадарку. Між іншым, не з дапамогай клятых капіталістаў-фэрмэраў, а з нашымі роднымі калгасамі і старшынямі. Дарма што апошнія найперш будуюць сабе катэджы. Але ж пасьля яны думаюць пра калгас;

5) абяцаць падымаць спорт. Будаваць лядовыя палацы і футбольныя манэжы. А то выступаюць на Алімпіядах нашы як недарэкі і няўмекі;

6) абяцаць разабрацца з карупцыянэрамі. Пасадзіць за краты ўсіх, каму ўжо даўно пара, каб ня кралі розныя там скрыні зь цьвікамі. Гэта вам ня жарты;

7) абяцаць уваскрасіць савецкі народ. Гэтаму нам дапаможа дзяржаўная ідэалёгія — абавязковы прадмет у школах і ВНУ;

8) абяцаць, што расейцам у Беларусі будзе жыць лепей, чым самім беларусам. Мы ж ня гнюсныя нацыяналісты. Прыгадайце, як у пачатку 90-х расейцы сядзелі на чамаданах;

9) абяцаць хуткі саюз з Расеяй. Пры тым абяцаць незалежнасьць;

10) і галоўнае, праводзіць усю сваю кампанію на «общедоступнам языке», на «каторым можна высказаць глыбокія чуйства».

Натуральна, што перадвыбарная кампанія апроч 10 вышэйпералічаных пунктаў мае шмат аспэктаў, але, як сьцьвярджаюць нашы суразмоўцы, калі кандыдаты возьмуць згаданыя абяцаньні ў свой арсэнал, то эфэкт ад гэтага будзе 100% і кандыдат абавязкова атрымае элегантную перамогу над супернікамі. Спадзяёмся, што на выбарах кандыдаты скарыстаюць нашы парады.

**Зьміцер Панкавец, Барысаў**

«НН» 10 ГАДОЎ ТАМУ

### Лукашэнка і самбрэра



АР

Вельмі ўжо да твару Алесю Рыгоравічу Лукашэнку звычайнае мэксыканскае самбрэра. Надта ж зручная рэч, нашмат лепшая за цюбяцейку ці генэральскую папаху. І ў сьпёку заўсёды цень знойдзеш, і ў дождж ня змокнуць дэпутацкія плечы. Насіў бы і насіў Алесь Рыгоравіч сваё самбрэра, у якім так хораша гойсаць на саўгасным «козьліку» ад кароўніка да сьвінарніка, але закінуў лёс Лукашэнку ды ў сталіцу.

Змог бы і ў горадзе Алесь Рыгоравіч насіць любы сялянскаму сэрцу галаўны ўбор, каб была ў яго службовая машына з адкрытым верхам. Але не такі ён чалавек, каб перарабляць машыну пад сябе і кідаць на вецер народныя грошы. І паспрабаваў Лукашэнка езьдзіць у грамадзкім транспарце, бо хацеў захаваць імідж простага мэксыканскага селяніна. Але як ты ўваб'ешся-ўшчэмішся ў лацінаамэрыканскай шапцы ды ў менскі тралейбус?! Раз брылі пакамечылі, другі пакамечылі, і давялося Алесю Рыгоравічу Лукашэнку павесіць сваё самбрэра на цьвік. Але ня траціць надзеі Лукашэнка, што надыдзе яго час, калі будзе ў яго машына з адкрытым верхам.

**Адам Глёбус, №7/1994**


## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на стар. 16

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб.

Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29


# Ратавальная твань

гумарэска

Руслан Равяка

Старшыня каапэратыўнай гаспадаркі «Шлях да Ільліча» сядзеў у сваёй хаце за місай з маласольнымі агуркамі, млосна ўглядаючыся ў тэлевізар. Бараньба за ўраджай падыходзіла да заканчэньня, шчасьлівыя калгасьнікі рабілі дажынкі, цягнучы ўвязаныя чырвонай стужкай снапы да новенькага прычэпа.

Гэтае чалавечае шчасьце ўсёй краіны канчалася, аднак, на мяжы яго калгасу. Гаспадарка правальвала ўсе тэрміны й паказчыкі. Заўтра сюды павінен быў прыляцець Сам, каб асабіста, трансьлюючы праз камэры БТ на ўвесь сьвет, сьцерці ў пыл нядбайнага гаспадара — небараку-старшыню.

І дзе ты там што дакажаш. Увесну ў райвыканкаме яму сказалі, што грошыкі пайшлі на будаўніцтва Бібліятэкі, таму гаспадарка павінна выкручвацца сама, а не чакаць дапамогі ад дзяржавы. І прапанавалі, дзеля абмену вопытам, па выканкамаўскай пуцёўцы наведаць Чэхію. Старшыня адправіў туды маладога агранома. Вярнуўшыся адтуль, малады спэцыяліст, аднак, запіў і на ўсе роспыты пра сельскую гаспадарку славянскай краіны, новапрынятай у Эўразьвяз, ляпаў адно — пра піўное арыентаваньне.

Невялікая вёсачка, якая гібела ад неўраджаю, бо знаходзілася на скале сярод лясоў і рэк, кінула займацца расьлінаводствам і пераключылася на забаўляльныя праграмы. З усёй Чэхіі едуць туды людзі, каб, начапіўшы на сьпіну скрыню мясцовага піва, пабегаць з мапай і компасам у руках па навакольлі. Той, хто здолее знайсьці на мапе першы пункт, атрымлівае там пляшку піва, выпівае, бярэ другую мапу і нясецца далей. Першы фіналіст, які абабег усе 10 пунктаў, узнагароджваецца бясплатнай папойкай піва ў мясцовай гасподзе. Астатнія ўдзельнікі забіраюць скрыні, якія цягалі за плячыма.

Прапанаваная ідэя тады старшыню спадабалася. Але замест піва для прыцягненьня турыстаў было вырашана выкарыстоўваць самагон і павялічыць колькасьць пунктаў да пятнаццаці.

Каля месяца гаспадарка замест нармальнай земляробчай працы займалася турыстычнымі падрыхтаваньнямі. Усе хаты былі падцягнуты да гатэльнага тыпу. Нават зямлянка бабці Стэфкі. Была націснута рэкордная колькасьць самагону. У гарадох разьвешаны аддрукаваныя на машынцы абвесткі: «Першае гарэлачнае арыентаваньне».

Чакаўся наплыў турыстаў і ўдзельнікаў, ня меншы за апошні нясьвіскі сярэднявечны фэст.

Аднак старшыня памыліўся — не прыехала ніводнага турыста! Затое прыбылі некалькі дзясяткаў тысяч удзельнікаў з усёй краіны і навакольля… Аднак, як выявілася, ніхто не жадаў нікуды з мапай бегчы. Усе ціхенька адыйшліся на колькі мэтраў ад месца старту і паселі на палянцы, адкаркоўваючы бутэлькі, што былі выдадзены ў якасьці цяжару на плечы. Самае жахлівае, што абслуга зь мясцовых калгасьнікаў таксама нікога не чакала, а адразу па сьвістку ўзялася за пляшкі.

Прыбытку акцыя ніякага не дала — папіўшы дармавы самагон, народ разьехаўся, нават не наведаўшы гасьцінна адчыненых дзьвярэй каапкрамы.

Праз падрыхтоўку да спаборніцтва забыліся на ўборачную, хаця, зрэшты, і ўбіраць не было чаго. А заўтра…

Раптоўна манатоннае балбатаньне тэлевізара пачало прыцягваць увагу старшыні. АНТ: «…У гэтым годзе ў Брытаніі вось ужо 19-ы раз адбываецца параалімпійская алімпіяда Сусьветнага спаборніцтва па заплыве ў твані. Гэтым разам у ім прынялі ўдзел спартоўцы з 20 краін сьвету. Пераможца, які здолеў праплысьці у каламутнай вадзе без паветра хутчэй за ўсіх, атрымлівае 10-працэнтную зьніжку на піва ў мясцовым пабе і магчымасьць трэніравацца ў любым балоце Брытаніі…»

«Вось яно, выратаваньне!» Старшыня ўскочыў на матацыклетку й панёсься па вёсцы зьбіраць жывёлаводаў.

Ранкам кілямэтар балота быў расчышчаны ад травы і сьмецьця. Уздоўж пракладзены кладкі для заўзятараў з райвыканкаму, а на дрэвах зроблены мягкія посьцілкі для снайпэраў з аховы.

Пераможца першых у краіне спаборніцтваў атрымліваў дармавую выпіўку на працягу трохгодкі ў калгасе «Шлях да Ільліча» і магчымасьць трэніравацца ў любой дрыгве Беларусі. 2-е месца — 10-працэнтная зьніжка за праполку буракоў, 3-е — воз брыкету. Таксама быў праведзены тэндэр на права продажу мясцовага бімбэру гасьцям і ўдзельнікам спаборніцтва.

Участковы, паддаты пасьля абвяшчэньня вынікаў тэндэру, шэптам запытаўся ў старшыні пра першае месца і ўзнагароду.

— Як, ты не дацяў, хто выйграе заплыў? Тэлевізар глядзець трэба… дурніца… асабліва зімою…

*Баранавічы*

# Кат лета

Сяргей Балахонаў

## Гарачае — не сырое

Даўнейшым беларусам дажджы перашкаджалі ваяваць. «Праліўныя дажджы ішлі праз некалькі дзён. Дажджы вельмі перашкаджалі перавозу гарматаў і іншай цяжкай зброі, і так моцна, што кароль не адзін раз загадваў адпрагаць коні ад сваіх собскіх вазоў, каб паскорыць пераправу», — пакінуў нам спамінак сакратар Сьцяпана Батуры. Сягоньня ж сакратары і маляры наракаюць на тое, што зачастае раскрываньне продухаў нябесных замінае ісьцінна-летнім формам баўленьня часу. Бітва за ўраджай для гараджан ня ўлік. І як толькі сонца пачынае ходаць хмары і перамагаць слупкі тэрмомэтраў, белыя целы імкнуцца выканаць колькі рытуалаў. Апячы сябе натуральным ультрафіялетам, выпіць гарэлкі ды нырнуць у трохі зьзелянелы Сож. Але апёкі — гэта не загар. Гэта чырвоныя палосы на руках, нагах і лбах дзяўчынак, што з задаволенаю стомай сустракаюць вечаровы халадок.



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

## Чэргі-качэргі

Летнія чэргі ў чыгуначныя касы доўгія, як зімовыя ночы. Хуткасьць пасоўваньня наперад роўная паўкроку за пятнаццаць хвілін. Людзі бяруць плойму квіткоў. Касіркі стукаюць па клявіятуры адным пальцам. Людзі патрабуюць зручных месцаў і прыдатных датаў. Касіркі прапануюць, што ёсьць + кансэнсус. За шклом касаў прыкмячаю каляндарык з сацыял-дэмакратаўскай ружай. Бянтэжуся дызайнэрскаму рашэньню — белай неахайнай палосцы зьверху. Зірнуўшы пільней, цямлю, што дызайнэр сацдэкаў невінаваты: белаю паперкай заклеены «крамольны» лёзунг «Беларусь в единую Европу!». Піцерскія бабы ды бабёнкі, што стаяць у дзьвюх чэргах адразу, абменьваюцца ўражаньнямі ад стаяньня ды наагул ад побыту ў нашай краіне: «Милый мальчик и говорит чисто. Совсем без белорусского акцента. Здесь это редкость всё же». Як і варта было чакаць, касы перад насамі палюбоўніц «медного всадника» зачыняюцца на перапынак.

## Мае быць

Цягнік прыцягваецца ў сталіцу на дасьвецьці. Патрэбны пункт гораду яшчэ не зусім даступны. Сквэрык між Ленінградзкай, Кірава і Сьвярдлова, як паглядзець, служыць камунікаму бясплатным матэлем. Ля скульптуры дамы, што сядзіць на лаўцы, адпачывае бомж. На іншай лаве — прыстойна апрануты хлопец. «Мабыць, капітальна пагудзеў», — мяркуе сябар. Сапраўды, навакольле проста ўсеяна знакамі нядаўняй хмяльной раскошы — парожнімі пляшкамі і плястыкавым посудам. Міліцыянты, што крочаць непадалёк, нікога не заўважаюць. Стаміліся за час ночнага дзяжурства. Дзяўчына з чыста гомельскім бляскам уваччу сядае на вольную лаву (да фальклёрнай Станіславы ейнай дупці вельмі далёка!) і павольна, як стрыптызэрка, скідвае апратку, разгортвае мапу гораду-героя Менску. Ёй мае быць цікава.

## Казытлівае пытаньне

Абшар дому адпачынку «На ростанях» падзелены на дзьве ўмоўныя часткі. У адной перабываем мы — беларусы, у другой — дзеці беларускіх габрэяў. Перамяшчэньні і для нас, і для іх даволі строга рэглямэнтаваныя.

Адміністрацыя д.а. хоча зьвесьці ўсе кантакты да мінімуму. Так нібыта патрабуюць фундатары. Агромністы сьцяг з зоркаю Давіда захінае сьцяну аднога з карпусоў. Абедаць мы крочым у абмін парадных парталаў, праз чорны ход і кухонныя памяшканьні. У гэтай далікатнай сытуацыі паўстае заканамернае пытаньне: нягож мы — колькісотгадовыя суседзі — перашкаджаем адно аднаму людзьмі звацца? Пэрсанал д.а. хваравіта рэагуе на кожныя падобныя пытаньнейкі. Azoj vi di cajtn, azoj di lajtn — якія часы, такія й людзі.

## Прывід Якуба Коласа

У гэтым драўляным двухпавярховіку апошнія гады жыцьця прабавіў Якуб Колас. Сканчаў трылёгію, адпраўляючы свайго Лабановіча ў камуністы.

Клясык блукаў між гэных хвояў, усьведамляючы, што сказаць больш важкага за «Мой родны кут…» ужо ня здолее. Колькі ні спрабую, не магу адчуць прысутнасьці ягонага духу. Няма тут ніякага духу. Марнымі і сьмешнымі выглядаюць патугі дзяўчат зладзіць сьпірытычны сэанс. Прывід Якуба Коласа блукае зусім у іншых мясьцінах. А сьпірытычныя сэансы ў дамох адпачынку часьцяком ператвараюцца ў сьпірытусовыя. Паскудзтва, брат, і не пытайся. «Ты самы разумны, — кажа гарадзенец Вітаўт. — Дакладна ведаеш, калі трэба сысьці, не баючыся нікога пакрыўдзіць».

## Прыдумай сабе раман

«Няма нічагуські прыямнейшага, як выдумваць новыя сьветы. Забываеш, наколькі бляклым быў той, у якім мы ўсе жывём… Не разумеў я тады, што выдумваньне новых сьветаў урэшце прыводзіць да зьмены нашага», — цьвердзіць галоўны герой апошняга па часе раману Ўмбэрта Эка «Баўдаліна». Вельмі проста напісаць на аркушы фармату А4: «Люблю атрымліваць ад жыцьця асалоду», — прыдумваючы такім парадкам сабе свой сьвет. А. і Д. робяць гэта амаль прафэсійна і з зайздросным імпэтам. Аднак у адрозьненьне ад Экавых пэрсанажаў, паненкі насяляюць выдуманыя прасторы не фантастычнымі фінсэрэтамі ці мэтацыпленарыямі, а канкрэтнымі дзядзькамі, якіх яны лічаць грубаватымі негабляванымі боўдзіламі і таму бяруцца іх перавыхаваць. Каб прынамсі палюбіць. Забаўка — замест курортных раманаў. Сапраўдны раман у малых групах і вузкіх рамках можа быць чарнаватым. А. і Д. у душ ходзяць разам. Мабыць, так больш бясьпечна.

## У Гомелі цот, а ў Менску лішка

Сябар цьвердзіць, нібы ў Менску прыгожых дзяўчат многа з тае прычыны, што красуні зьяжджаюцца сюды з усёй Беларусі. Можа, і так. Але выпіндосаў з вопраткай, фрызурамі, макіяжам сталічныя пані прэзэнтуюць значна болей, чымся нашыя «правінцыялкі». Чыста не ўяўляю, каб у якім-кольвек гомельскім тралейбусе дзяўчына ўзялася падфарбоўваць сабе вусны або прыпудрываць носік. У менскім мэтро гэта, як відаць, мажліва.

## «Дождж вялікі спаў на зямлю…»

«Дзесяць год у палоне — гэта круглая дата», — сьпявае Лявон Вольскі. Самы час нябеснай акадэміі прадэманстраваць электарату, хто насамрэч распараджаецца надвор'ем, хто «даждыцца на справядлівыя і на несправядлівыя». І што ж? «Даў Гасподзь громабіцьцё і дождж». Вада ліецца шчодра. Электрыка вырубаецца паступова. Узьнікаюць макраватыя подумы — калі не аб усясьветнай паводцы, дык пра паўгадовыя залевы з жыцьцяпісу неўміручага беларуса палкоўніка Аўрэліяна Буэндзія. Люда і Андрусь вяртаюцца самаходам зь Менску (у Люды, уражанай бясконцымі навальнічнымі сполахамі, круглыя вочы). Прывезьлі на наш адпачынкавы востраў сёе-тое для сьвяткаваньня яшчэ адной даты з найноўшай гісторыі. Нязбыты Дзень Незалежнасьці. Сьвечак няма. Імправізаваны стол рыхтуецца пры сьвятле запальнічак і мабільных тэлефонаў. П’ецца, есца і пяецца ў цемрадзі. Эх, каб цёмны ня быў…

## Беражэце беларускі лес! Палеце расейскі газ!

Мікола наўмысьля ўдае зь сябе клоўна. Распавядае показкі і прыказкі (пераважна вельмі сальныя) апошніх гадоў дваццаці пяці. Гэта не замінае яму няблага валодаць памяткавым апаратам сацыяльна-палітычных дысцыплін і быць пацыфістам. У прыватных размовах усё гэта вытанчана пераплятаецца: анэкдотавыя тампаксы і загіпнатызаваныя карэйцы-пагранічнікі мірна суседзяць з грамадазнаўчымі біфуркацыямі, абдыкацыямі, агрэгацыямі групавых інтарэсаў. Пытаюся, ці не займаецца літаратарствам. Кажа, што спрабаваў у юнацтве, але не пакаціла. Вышэйшую адукацыю ён атрымаў у самым пачатку незалежнасьці. Год служыў у войску. Прыгадвае, наколькі ганарыліся хлапцы, якім перападала шчасьце атрымаць новыя несавецкія шаўроны ці цэшкі з «Пагоняй» і бела-чырвона-белым сьцягам. Прыпамінае афіцэраў, якім занадта радыкальнай здавалася беларуская каманда «Крокам руш!»: «Это как?» Пасьля службы Мікола амаль выпаў зь беларускага кантэксту, і далейшыя гістарычныя падзеі праходзілі паўзбоч яго ўвагі. Не пытаю, з чым гэта зьвязана. Мусіць жа быць у чалавека таямніца. «Беражэце беларускі лес! Палеце расейскі газ!» — павесіў Мікола прывабны заклік у прыродазнаўчым кутку сваёй школы.

## Дамоў

Да ад’езду ў Гомель пасьпяваю пабачыць хаўрус суданскіх і эРБэшных сьцягоў, пачуць ёканьне спэцсырэнаў, спрыкмеціць галоўны «мэрс» краіны. Неўпрыцям успамінаюцца аўтамабілі зь мясам для партыйнай намэнклятуры з «Малога апакаліпсісу» Тадэвуша Канвіцкага. Сонца пячэ. Ад гэтага сквару ўлегцы кружыцца галава, а перад вачыма мігцяць фіёлкі. У цягніку зь сябрам п’ём халоднае піва і лузаем фісташкі. Наракаю, што не купілі новага нумару «НН», і ўвадначас заўважаю, што хлапец на наступнай бакавушцы чытае акурат яго. Сябар ветліва просіць пазычыць на пэўны час газэту. Гаспадар без ваганьняў згаджаецца. Усё добра, што ў час. Адлегласьць да Гомелю ў развагах над актуаліямі добра скарачаецца. Сюды-туды па вагоне шлындае з мабільнікам у руках дзевяцікласьніца, якую неўзабаве я буду вучыць любові да нашае мілае Бацькаўшчыны. Але пакуль я выходжу на пэрон, апускаюся на калені і цалую родны горад. Калі ня верыце, спытайце ў гамельчукоў…

Аляксандар Ворвуль

# Слоўнік скептыка



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вартасьць** — недахоп, якім пачалі ганарыцца.

**Васьміног** — жывёла, у якой ногі растуць ад вушэй, рукі — з дупы, а дупа з вушамі.

**Вельмі прыемна** — самая пашыраная хлусьня на сьвеце.

**Вера** — нежаданьне разумець.

**Вожык** — істота, якая размнажаецца асьцярожна.

**Вугал просты** — вугал, які кіпіць пры 90°.

**Вучыцца** — тое, што трэба рабіць, каб мала зарабляць.

**Выбары прэзыдэнцкія** — гонка на трамваях.

**Выміраньне** — гэта калі жывёла з Чырвонай кнігі паядае расьліну з Чырвонай кнігі.

**Вынаходнік** — чалавек, які ня ведаў, што гэта зрабіць немагчыма.

**Выпадковасьць** — непазьбежнасьць, якая раптам сталася.

**Выпівоха** — той, хто п’е болей, чым ты.

**Высокамаральнасьць** — канцэпцыя, якая перамагае толькі на трэніроўках.

**Вытрымка** — здольнасьць з асалодай слухаць, як вам расказваюць ваш любімы жарт.

**Выхаваньне** — навучаньне дзяцей уменьню абыходзіцца без выхавальнікаў.

**Вэгетарыянец** — той, хто аб’ядае жывёл.

**Вэстэрн** — фільм, дзе думаюць толькі коні.

**Вэтэран** — тытульная нацыянальнасьць Рэспублікі Беларусі.

**Вядомасьць** — магчымасьць быць пачутым, за якую плаціш мажлівасьцю быць асьмяяным.

**Вясельле** — гэта калі мужчына ўжо не купляе кветак і пакуль не купляе гародніны.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Фабрыка жахаў



Сёньняшная перадвыбарчая кампанія дабавіла ў лексычны багаж беларускіх палітычных піяршчыкаў слова «тэрарызм». «Тэрарыст!» — «Сам ты тэрарыст!» — новая формула палітычнай палемікі.

Прыходжу да высновы, што неспакойная душа вісконсынскага сэнатара Макарты, які падазраваў, што Мэрылін Манро — загадчыца аддзелу па рабоце з нэграмі ў галівудзкім райкаме КПСС, знайшла сабе абалонку. Здаецца, яе прытуліла цела Азаронка, які ўжо давёў, што тэкст белавескай дамовы Шушкевіч раджаў пад дыктоўку бэн Ладэна, а ў Антончыка на падаконьніку стаіць кактус. Для агентаў «Аль-Каіды», якія выкарыстоўваюць Антончыкаў флэт для адпачынку пасьля Бэслану, расьліна — знак, што яўка не правалена.

Апазыцыя таксама ня сьпіць у шапку. Стыкерам «Супраць лукашызму — супраць тэрарызму» невядомы зубр памесціў слуп каля Палацу мастацтва. Сайт «Хартыі-97» стаў доўга грузіцца праз банэр з тым самым слоганам.

Дзіўная рэч адбылася са словам «тэрарызм». Як піша Сафі Ваніш, тэрарыстамі ўпершыню называла сябе група дэпутатаў-якабінцаў — Сэнт-Жуст, Рабэсп'ер, Дантон. Гэтым якабінцам мы сярод іншага абавязаны «Дэклярацыяй правоў чалавека і грамадзяніна» — прабабкай усіх канстытуцый, у тым ліку і эрбэшнай. Атрымліваецца, што ППРБ — гарант справы тэрарыстаў.

Тэрарыстамі называлі сябе Пуліхаў і Грынявіцкі, але чамусьці Азаронак ня трызьніць, што Севярынец начамі выклікае душу эсэраўнябожчыка, каб даведацца пра сакрэт вырабу дынаміту.

Калі разумець пад тэрарызмам не ідэалёгію, а канкрэтны этас, форму дзеяньня, дзе галоўную ролю адыгрывае замах, то Лукашэнка дарма раскатаў губу ўвайсьці ў аналы як самы буйны айчынны змагар з тэрарызмам. Ніхто не адбярэ гэтых лаўраў у сп.Кубэ. Перад тым як Мазанік адправіла яго ў Вальгалу, гаўляйтэр пасьпеў правесьці маштабныя чысткі супраць асобаў, якія сыстэматычна, прычым зь яўным намерам і па змове, займаліся замахамі на прадстаўнікоў улады. Лукашэнкаўскія рэйнджэры, якія на «Шчыце Айчыны» разьбіваюць цагліны аб галовы, — на фоне карнікаў СС не змагары з тэрарызмам, а аматары.

Сытуацыя — зашыбіся! «Тэрарыст» — у Беларусі слова з абстрактнай нэгатыўнай канатацыяй, накшталт «фашыст» або «сатаніст». Канкрэтна праяў тэрарызму няма, што гэта такое, ніхто ня ведае, але безь яго рабіць вялікую палітыку ўжо немагчыма. Упершыню глябальныя (пераважна амэрыканскія і расейскія) жахі лякалізуюцца на беларускай глебе. Дзякуючы ўздыму камунікацый антыгероі масавай сьвядомасьці вялікіх дзяржаў робяцца нашымі антыгероямі. Мясцовая публічная палітыка набывае цікавую формулу — давесьці, што твой апанэнт падобны да ліхадзеяў з амэрыканскіх і расейскіх мэдый, і дэманізаваць яго.

Згодна з часопісам «Stern», у наступнай дэкадзе галоўнымі праблемамі чалавецтва станець глябальнае пацяпленьне, дэфіцыт нафты і сутыкненьне зь іншапляннэтнай цывілізацыяй. З заміраньнем сэрца чакаю кампаніі 2011 г. і фільму Азаронка аб тым, што Лебедзька — зялёны гуманоід.

**Лёлік Ушкін**




**Хто кароль бэнзакалёнкі? Старонка 7.**

КАІСА

# Філідор застаўся б задаволены

«Альбіно» — ня толькі самвыдавецкі бюлетэнь для шахматыстаў, рэдагаваны луніненцкім «чалавекам году-2003», гісторыкам і паэтам Вадзімам Жылком. Гэта яшчэ й надзвычай душэўная тэма ў складаньні твораў шахматнай кампазыцыі. Душэўная — бо пешка, якая, паводле славутага азначэньня французкага музыкі Франсуа Андрэ Філідора, ёсьць душой шахмат, у тэме «альбіна» адыгрывае ключавую ролю, дапамагаючы заматаваць караля чорных. Во як растлумачыў «НН» сутнасьць гэтага клясычнага задачнага сюжэту сам сп.Жылко: «Уявіце сабе любімую пешку Астапа Бэндэра — е2. У працэсе гульні яна можа рушыць на е4, можа на е3, а пры нагодзе здольная пабіць чорную фігуру на f3 ці на d3. Дык вось, калі пры рашэньні задачы прысутнічаюць усе гэтыя чатыры хады (зразумела, у розных варыянтах), гэта якраз і значыць, што аўтар задачы зьвярнуўся да тэмы «альбіна». Выявіць сябе ў тэме могуць усе пешкі белых, апрача крайніх, а2 і h2, што маюць у «запасе» толькі тры, а не чатыры розныя хады. Аналягічная гульня чорных пешкамі b7—g7 называецца «пікеніні». Кажуць, што амэрыканскі шахматны кампазытар ахрысьціў гульню жвавых чорных пешачак у гонар свайго сябра-нэгрыцёнка *Piccaninny*. Зазвычай тэмы «альбіна» і «пікеніні» выкарыстоўваюцца кампазытарамі ў спалучэньні зь іншымі задумамі, але не абавязкова».

На дыяграме — двухходоўка шклоўскага праблеміста Ўладзімера Ціханкова. Ён аўтар каля 60 задач, прызэр чэмпіянатаў краіны па складаньні, аўтар праекту адкрыцьця ў Шклове міжнароднага цэнтру шахматнай думкі…

Летуценьні летуценьнямі, а задача пекная. Падказка: у ёй рэалізавана тэма «альбіна». Першыя тры чытачы, якія дашлюць у «НН» рашэньне задачы, атрымаюць маленькі прыз «Каісы».

**ВР**

## Рашыце задачу

**У.Ціханкоў, 1982.**

**Мат за 2 хады.**



Запрашаем у вандроўку
**Świadek prawdy**

*...час і беларусам памаліцца за Айчыну.*
кс. Ежы Папялушка

**6** лістапада
**ВАРШАВА ЧАСОЎ «САЛІДАРНАСЬЦІ»**

Пачатак польскага руху адраджэньня, змаганьне за вольнасьць Польшчы, барацьба на вуліцах Варшавы, месцы народнага ўздыму.

**Тэлефоны: 661-30-38, 202-23-38 (Алена), 755-03-70 (Зьміцер)**
**Кошт: 25 у.а. + віза**

**10** кастрычніка
**запрашаем у вандроўку**
**Ракаў—Івянец—Дзяржынава**



**Ракаў:** касьцёл дамініканцаў, званіца Сьвятой Ганны, Праабражэнская царква.
**Івянец:** касьцёл Сьвятога Аляксея, манастыр францысканцаў, сядзіба
**Дзяржынава:** мэмарыяльны комплекс Ф.Дзяржынскага.
**Адпачынак:** абед на прыродзе.
Кошт вандроўкі — 25000.
**Т.: 222-88-76, 551-30-75.**

**Запрашаем у падарожжа**
**10 кастрычніка** (нядзеля)
**«Замкі Беларусі»**: Дуды—Іўе—Ліпнішкі—Ліда—Наваградак—Любча—Мір
**16 кастрычніка** (субота)
**«Астравецкі раён»**: Смургонь—Жодзішкі—Міхалішкі—Гервяты—Варона—Варняны—Трокенікі—Астравец—Гудагай.
Цана 20000 рублёў.
Т.: 232-54-58, 622-57 –20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**З Днём настаўніка** віншую пэдкалектыў Нашага Ліцэю. Зычу плёну ў справах, моцы ў змаганьні. Гадуйце і гартуйце годных асобаў. Беларусачка

**З Днём Тычара** віншуйма яснавяльможную прафэсарку ангельскае філялёгіі Джоан Маліноўску, доатар оф Уладзімер! Сынсырлі ёрз, Глёрыхолдар, па-Ган-ка, Аляксандар, Мар'ян

**Віншуйма дзядзьку** Алеся Лагвінца з рэгістрацыяй кандыдатам у дэпутаты! Сухараўчане, падтрымаце эўрапейскі шлях свайго заходняга раёну!!! Верым у перамогу. Уладзь Б., Ганунька Ж., Тацянка Ф., Андрусь В.

**Дзякуй, Ала Мікалаеўна**, за цудоўныя вершы! Са шчырай павагай і захапленьнем. Віка

**Прывітаньне, Ульянка!** Калі ты побач, мне лягчэй крочыць па школьнай дарозе. Дзякуй за тое, што ты ёсьць!

### КАНТАКТЫ

**Малады хлопец** (Аляксандар) пазнаёміцца зь дзяўчынай 17—21 году для сяброўства. Адкажу на ўсе лісты. Пішыце: sajat@tut.by

**7 кастрычніка** а 18-й на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) адбудзецца арганізацыйны сход фан-клюбу беларускай музыкі

**9 кастрычніка** а 12-й у клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») адбудзецца сустрэча зь лідэрам групы «Нэйра Дзюбель» Аляксандрам Кулінковічам

**Хто любіць** сьпяваць пад гітару альбо так — завітвайце! «Сьпеўнік Беларускі» ў Сеціве: http://bs.studenty.org

### КВАТЭРА

**Дзьве акуратныя**, ветлівыя, выхаваныя студэнткі шукаюць 1-2-х пакаёвую кватэру. Т.: 608-44-83. Электроны адрас: siarzhukBaj@tut.by

### КНІГІ

**Куплю** «Беларускую энцыкляпэдыю», т. 1—3 і 6—7; «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», т. 4, 5. Т.: 613-70-85. Алесь

**Прадам** кнігі: «Археалёгія і нумізматыка Беларусі»(энцыкляпэдыя), «Этнаграфія Беларусі» (энцыкляпэдыя), «Архітэктура Беларусі» (энцыкляпэдыя), «Кампазытары Беларусі» (энцыкляпэдыя) ды інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», т.4, 5, Л.Юрэвіч «Камэнтары», А.Цьвікевіч «Западно-руссизм», творы У.Галубка, Я.Дылы, паэзія, пераклад на беларускую мову: Гейнэ, Шэксьпір, Уітмэн, Элюар ды інш. Т.: 236-02-15

### ПАСЛУГІ

**Вазьму на рэалізацыю** ў Віцебску беларускае сувэнірнае ганчарства — вазачкі, падсьвечнікі, лепку etc. Электронны адрас: vjasna@tut.by. Т.: 710-54-20, (0212) 24-18-57 (хатні). Міхал

**Ангельская мова**: рэпэтытарства, кантрольныя й пераклады. Зьвяртайцеся на тэл.: (8-029) 765-46-07 альбо 216-81-76 з 20.00 да 12.00. Раман

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Антону Л. з Горадні.** Стратэгія і тактыка абмяркоўваюцца перад палітычнай кампаніяй і па выніках яе. Надрукуем Ваш артыкул пасьля 17 кастрычніка пры ўмове, калі адкажаце «хто вінаваты» і «што рабіць». Пакуль Вы ставіце адвечныя пытаньні і пакідаеце іх без адказаў. Гэта проста, але нецікава.

**Зьмітру П. з Кастрыцы.** «Аўтобус» — не газэтнае. Бо больш імпрэсія, чым сюжэтная рэч.

**Міхасю В. з Слоніму.** Дакумэнты атрымалі, дзякуй.

**Берасьцейскаму спажыўцу.** Вашыя ідэі перакажам зацікаўленым. Праўда, слова «срок» — расейскае. Па-беларуску трэба «тэрмін».

**В.К-ну зь Менску.** Водгук перадалі Л.Баршчэўскаму.

**Пятру Ш.** Раман «Прэзыдэнт» не для газэты. Прапануйце ў часопіс.

**Сяргею П. зь Менску.** Пра канчатковае ўнармаваньне беларускай літаратурнай мовы яшчэ рана гаварыць, а пэдантычная рэглямэнтацыя «зьверху» прывядзе да вызалошваньня лексыкі, сынтаксісу ды індывідуальных асаблівасьцяў мысьленьня і стылю, яскравым прыкладам чаго была літаратура і навука позьнесавецкага часу.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сягей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3494. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 6.10.2004.
Замова № 6142.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а